*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ЛІПЕНЯ 2009 г.
СУБОТА
№ 137
(26495)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## ЁСЦЬ ПЕРШАЯ ТЫСЯЧА!

**Экіпаж камбайнераў з Рэчыцкага раёна намалаціў у засекі Радзімы першую тысячу тон збожжа.**

На імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі паступіла тэлеграма з Рэчыцкага раённага выканаўчага камітэта.

Паведамляецца, што 22 ліпеня экіпаж камбайна «Лексіён-600» КСУП «Агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна ў складзе Валянціна Саламахі і Аляксандра Граня першым у Гомельскай вобласці намалаціў 1000 тон збожжа ўраджаю 2009 года.

«У Год роднай зямлі абяцаем утрымаць узяты здзел, не дапусціць страт і з гаспадарскім падыходам павялічваць засекі роднай Беларусі», — гаворыцца ў тэлеграме.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі пракантралюе на месцах выкананне даручэння па скарачэнні складскіх запасаў

**Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі будзе кантраляваць выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы па скарачэнні складскіх запасаў на прадпрыемствах з выездам непасрэдна на месцы. Аб гэтым паведамілі ў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы.**

Па выніках праведзенай 23 ліпеня нарады Прэзідэнта з кіраўнікамі беларускіх загранустаноў Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу Адміністрацыі Прэзідэнта арганізаваць маніторынг вытворча-фінансавай дзейнасці важнейшых прадпрыемстваў, якія вызначаюць развіццё галін і рэгіёнаў, а таксама прадпрыемстваў, якія выпускаюць прадукты харчавання, са штотыднёвым дакладам Прэзідэнту аб выніках.

Пры гэтым асаблівая ўвага будзе надавацца прадпрыемствам перапрацоўчай прамысловасці. Работа будзе праводзіцца з выездам супрацоўнікаў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі на месцы. Аб гэтым быў праінфармаваны кожны з членаў урада.

Першы даклад кіраўніку дзяржавы запланаваны на 1 жніўня.

**БЕЛТА.**

Кампетэнтна

## АДКУЛЬ ПАЛЬМАВЫ АЛЕЙ У БЕЛАРУСІ?

**Учора адбылася прэс-канферэнцыя кіраўніка Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Сямёна ШАПІРЫ. У размове актыўна ўдзельнічалі расійскія журналісты, якія ў складзе чарговага прэс-тура знаёмяцца з жыццём і эканомікай нашай краіны. З іх падачы ў размове дамінавала малочная тэма. Дыялог міністра з расійскімі журналістамі акрэсліў цікавыя тэмы. І першае пытанне: ці паспее Беларусь да 1 жніўня г. г. выканаць усе заўвагі і патрабаванні Рассельдзяржнагляда да малочных прадуктаў, якія пастаўляюцца на рынак Расіі?**

### І 500 — выдатная лічба

Сямён Шапіра сказаў, што гэта работа вядзецца пад пастаянным жорсткім кантролем. Штодзень выдаюцца дзясяткі (40—50) новых дазволаў і сертыфікатаў. Ужо на дзень прэс-канферэнцыі павінна быць афармлена больш за 500 санітарна-гігіенічных заключэнняў на беларускую малочную прадукцыю, зазначыў міністр. А ўсяго на экспертызу здадзена амаль 900 узораў розных відаў малочнай прадукцыі. І ўсе іх адразу праверыць проста немагчыма, ды і, на думку міністра, не заўсёды мэтазгодна. Увогуле і 500 — выдатная лічба. Тым больш, што яна ўключае ў сябе асноўныя віды малочнай прадукцыі: сыры, сметанковае масла, тварог і інш. У прынцыпе Беларусі дастаткова для поўнамаштабнага экспарту ў Расію і 500 назваў малочнай прадукцыі. Не паспее наша краіна аформіць належным чынам усе яе віды да 1 жніўня г. г. — не бяда. Зробім гэту справу крыху пазней, лічыць міністр. Бо сертыфікацыя прадукцыі — гэта пастаянны працэс.

### Новыя дырэктары — новыя падыходы

Сямён Шапіра прызнаўся, што па яго ініцыятыве вызвалілі чатырох дырэктараў малочных заводаў, бо не цягнулі. Як трымаць кіраўніка на пасадзе, калі на яго прадпрыемстве мінус 29 працэнтаў рэнтабельнасці, а ў дырэктара ніякіх думак наконт выхаду з цяжкага становішча. І гэта ва ўмовах крызісу!

Потым Сямён Барысавіч паправіў сам сябе, сказаў, што міністэрства нікога не здымала, а толькі рэкамендавала акцыянерным таварыствам вызваліць дырэктараў, якія правалілі справу. Так ці не так, але гэта не вельмі важна. Бо, сапраўды, новая эканамічная сітуацыя патрабуе і новага тыпу кіраўнікоў, а не адстаўных раённых начальнічкаў, скажам, былых старшынь не вельмі моцных калгасаў, якіх некалі перасаджвалі ў крэслы дырэктараў малочных заводаў, каб дапрацавалі паціху да пенсіі. Таму менеджмент у галіне трэба абавязкова мяняць, кажа міністр. Ён прывёў у прыклад Расію, дзе ў асноўным дырэктары малочных заводаў — гэта маладыя людзі 25—35 гадоў з веданнем і моў, і маркетынгу і г. д.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Грошы

## ЗА ПАЎГОДА ЎКЛАДЫ ПАПОЎНІЛІСЯ АМАЛЬ НА BR3 ТРЛН

**З пачатку года ў разліку на аднаго жыхара нашай краіны на 315 тысяч папоўніліся зберажэнні, што трымаюць людзі ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах: на 1 ліпеня на аднаго беларуса прыходзілася 1 716 600 рублёў зберажэнняў, што размешчаны ў дэпазітах і сертыфікатах.**

За паўгоддзе, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік **начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ,** прырост прыцягнутых сродкаў фізічных асобаў у банкі склаў амаль 3 трыльёны рублёў, ці 22,5 працэнта. За чэрвень у зберажэнні ў разліку на аднаго жыхара «капнула» 44 тысячы 300 рублёў (за май — 24 300 рублёў).

На пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка, якое прайшло ўчора, таксама адзначалася, што беларускія банкі актыўна крэдытуюць і будаўніцтва жылля. Так, за паўгоддзе фізічным асобам і сельскагаспадарчым арганізацыям было выдадзена толькі льготных крэдытаў амаль на 2 трыльёны рублёў, што ў 1,7 раза перавышае аб'ём выдачы льготных крэдытаў на мэты жыллёвага будаўніцтва за адпаведны леташні перыяд. Расце аб'ём і спажывецкіх крэдытаў. На пачатак гэтага месяца запазычанасць фізічных асобаў па спажывецкіх крэдытах склала амаль 5,8 трыльёна рублёў, што ў 1,3 раза больш, чым на пачатак леташняга ліпеня.

Паводле звестак галоўнага банка краіны, доля безнаяўных аперацый у агульным аб'ёме аперацый з выкарыстаннем картак у беларускіх рублях дасягнула 44 працэнтаў па колькасці аперацый і 10,5 працэнта — па суме аперацый. Цяпер у цэлым па краіне эмітавана 6,5 мільёна пластыкавых картак, функцыянуе 2591 банкамат, 2534 інфакіёскі, 16 505 плацежных тэрміналаў у 10 409 арганізацыях гандлю і сэрвісу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## «Транснафтапрадукт» аднавіў прапампоўку дызельнага паліва па трубаправодзе «Унеча—Вентспілс»

Помпавыя агрэгаты былі ўключаныя ўчора ў 18.00 па маскоўскім часе. Нейкі час павінен пайсці на выхад сістэмы на тэхналагічны рэжым.

Як паведамлялася, з 17 ліпеня гэтага года эксплуатацыя беларускага ўчастка нафтапрадуктаправода «Унеча—Вентспілс» была спыненая з-за яго нездавальняльнага тэхнічнага стану. Пасля апошняй дыягностыкі прадуктаправода, праведзенай нямецкай фірмай, было выяўлена і запланавана да першачарговай ліквідацыі ў 2008—2009 гадах 1082 дэфекта. Ва ўстаноўлены тэрмін былі ліквідаваны ўсяго толькі 254 дэфекты, або 23,5 %.

Начальнік дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем прац у прамысловасці МНС Беларусі Віктар Бароўскі паведаміў, што праведзеныя дзве працоўныя нарады з кіраўніцтвам «Заходтранснафтапрадукту». Прынята рашэнне, што кампанія распрацуе і прадаставіць у Дэпартамент графік ухілення дэфектаў трубаправода, разлічаны да снежня 2009 года.

**БЕЛТА.**

ISSN 1990 - 763X

Фота БЕЛТА.



## ПАПЛЫЛІ!

**У сталіцы ў раёне вул. Няміга, дзе 23 ліпеня з-за ліўню адбылося падтапленне, учора вады было яшчэ больш.**

Больш як 300 чалавек былі эвакуяваныя з затопленых памяшканняў і грамадскага транспарту. Апошнім выратавальнікі вынеслі на руках з аднаго затопленага аўтобуса кандуктара, а вадзіцель са словамі «карабель не пакіну» застаўся ў кабіне. Былі адкрытыя вадасцёкі, каб палегчыць пропуск вады, выратавальнікі адпампоўвалі ваду ў Свіслач. У раёнах затаплення працавалі больш за 30 адзінак выратавальнай тэхнікі.

Таксама затапіла частку праспекта газеты «Звязда». У асноўным аказаўся затопленым участак дарогі каля гасцініцы «Звязда». Машыны, якія былі прыпаркаваныя каля бардзюра, знаходзіліся ў вадзе па шкло і ніжнюю частку даху. Некаторыя вадзіцелі спрабавалі аб'ехаць па тратуары, але захрасалі ў балоце, якое ўтварылася з-за ліўню.

**Ул. інф.**



Фота БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### У нядзелю зноў моцныя дажджы

**Пра гэта рэдакцыі паведаміў начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Такім чынам, 26 ліпеня на працягу сутак часам на ўсёй тэрыторыі краіны будуць ісці дажджы, уначы па Гомельскай і Магілёўскай абласцях, а ўдзень па Віцебскай вобласці месцамі моцныя ліўні, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ноччу 9—15, удзень 16—23 градусы.

У панядзелак уначы амаль паўсюдна, а ўдзень па паўночна-ўсходняй палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 9—16, удзень 17—23, па паўднёвым захадзе да 25 цяпла.

У аўторак—чацвер надвор'е крыху палепшыцца.

Сіноптыкі паведамляюць, што ў чацвер у другой палове дня ў Мінску толькі за 25 хвілін выпала 11 мм ападкаў, што адпавядае 11 літрам на квадратны метр. Такі дождж адразу выклікаў лакальную паводку ў многіх мікрараёнах горада.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*P.S. Учора па стане на 16.30 у Мінску ўжо выпала 42 мм ападкаў пры месячнай норме 90 мм. Падчас моцнага ліўня быў зафіксаваны вецер хуткасцю 17 м/сек, а таксама назіраўся град памерам 10 мм.*

## НАТАЛЛЯ ПЯТКЕВІЧ НАЗВАЛА НЕДАРЭЧНЫМІ ПАГРОЗЫ Ў АДРАС БЕЛАРУСІ НЕЙКІХ «АНАНІМАЎ»

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Пяткевіч пракаментавала выказванні неназванага высокапастаўленага супрацоўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі аб тым, што «апошнія заявы Аляксандра Лукашэнкі могуць прывесці да сур'ёзных фінансавых праблем для Беларусі», паведамілі БЕЛТА ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.**

«Такія каментарыі выклікаюць як мінімум здзіўленне, — адзначыла Наталля Пяткевіч. — Бо толькі на бягучым тыдні кіраўнік беларускай дзяржавы неаднаразова заяўляў аб тым, што Беларусь лічыла і лічыць Расію сваім галоўным саюзнікам і зацікаўлена ва ўмацаванні яе эканамічнага патэнцыялу і міжнародных пазіцый».

Паводле слоў першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, не далей як 23 ліпеня, на нарадзе з кіраўнікамі беларускіх загранустаноў Прэзідэнт падкрэсліў непарыўную гістарычную сувязь паміж нашымі краінамі і народамі і выказаў аптымізм адносна перспектыў саюзнага будаўніцтва.

«На гэтым фоне адкрыта недарэчнымі выглядаюць пагрозы ў адрас Беларусі з боку нейкіх «ананімаў», што стала ўжо непрыгожай практыкай», — падкрэсліла яна.

«Абсурдныя таксама спробы раздзьмуць ажыятаж, і тым больш надаць палітычны характар тэхнічным растлумачэнням МЗС Беларусі, якія датычацца парадку ўезду беларускіх грамадзян з Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ў Грузію», — лічыць Наталля Пяткевіч.

«У нашай пазіцыі адносна Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ніякіх змяненняў не адбылося. Усё астатняе — здагадкі ангажаваных палітолагаў і газетчыкаў», — падкрэсліла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ДОМ МАСКВЫ Ў МІНСКУ



Фота БЕЛТА.

**Дом Масквы, які адкрыўся ўчора ў Мінску, дапаможа рэгіёнам Расіі набыць новыя магчымасці для эфектыўнай рэалізацыі сумесных з Беларуссю праграм. Аб гэтым заявіў на цырымоніі адкрыцця культурна-дзелавога цэнтра «Дом Масквы» першы намеснік мэра расійскай сталіцы Уладзімір РЭСІН.**

Учора першы віцэ-мэр Масквы разам з выконваючым абавязкі мэра Мінска Мікалаем Ладуцькам перарэзалі чырвоную стужку, азнаменаваўшы адкрыццё дома. Культурна-дзелавы цэнтр знаходзіцца ў адным з самых маляўнічых месцаў беларускай сталіцы — на вуліцы Камуністычнай недалёка ад ракі Свіслач. У будынку размяшчаюцца шматпрофільныя функцыянальныя памяшканні павышанай камфортнасці з сучасным офісным абсталяваннем, кінаканцэртнай залай на 300 месцаў, канферэнц-залай, бібліятэкай, студыйнымі памяшканнямі, выставачнымі заламі, міні-атэлем класа трох зорак і аўтастаянкай. У доме ёсць рэстаран, кавярня, прадугледжаны памяшканні прадстаўніцтваў кампаній, арыентаваных на супрацоўніцтва з Масквой.

**БЕЛТА.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.07.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 821,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 005,82 |
| 1 латвійскі лат | 5 698,41 |
| 1 літоўскі літ | 1 160,55 |
| 1 чэшская крона | 156,93 |
| 1 польскі злоты | 950,63 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 90,60 |
| 1 украінская грыўня | 355,29 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,1372 |
| UAH | 39,1663 |
| 1000 BYR | 11,0494 |
| EUR | 44,1712 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## ПРОСІМ МІРУ І СПАКОЮ ДЛЯ КРАІНЫ, А ЎСІМ ЛЮДЗЯМ — ЗДАРОЎЯ

*24 ліпеня ў Быхаве адзначылі 350-годдзе Баркалабаўскага абраза Божай Маці*

**Сотні людзей сабраліся ў Свята-Троіцкім храме і вакол яго, каб адзначыць свята цудатворнага абраза. Вернікі з Магілёва і Бабруйска прайшлі хросным ходам у Быхаў. Сюды прыехалі паломнікі з самых розных куткоў Беларусі.**

Сем'і з маленькімі дзецьмі, старыя і маладыя людзі імкнуліся праціснуцца ў царкву, каб паставіць свечку і дакрануцца да Баркалабаўскай Божай Маці. Старажытны абраз, упрыгожаны кветкамі, ззяў пазалотай у святле шматлікіх свечак.

— Я схіляюся перад гэтым абразам, — сказаў 80-гадовы жыхар Быхава Рыгор Чэрствы. — Заўсёды іду да яго, прашу дапамогі ці ўдачы, і мне абавязкова шанцуе.

— Я веру ў Бога і навуку, — паведаміла Лілія Савельеўна, абдымаючы двух унукаў у святочных строях. — Навука дае нам лекі, а Бог нас захоўвае. Буду прасіць у Баркалабаўскай Божай Маці міру, здароўя і дабрабыту для ўсіх людзей на зямлі.

— Мы прыехалі ў Быхаў з Мазыра, таму што шмат чулі пра цудатворны абраз, — расказалі Аксана і Юрый Кананові чы, якія здолелі трапіць у храм з трыма маленькімі дочкамі. — Хочам прасіць здароўя. Спадзяёмся і верым.

— Я папрашу, каб мая вучоба была паспяховая і каб мае сёстры былі здаровыя, — сказала дзяўчынка Марыя.

Пасля службы і традыцыйнага хрэснага ходу вакол царквы адбылася свецкая частка святкавання юбілею. У памятным гашэнні паштовай маркі «350 гадоў Баркалабаўскаму абразу Божай Маці» брала ўдзел намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Ніна Гаўрылава, епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка, старшыня Быхаўскага райвыканкама Мікалай Кароцін і іншыя.

— Наша правінцыя жыве вельмі актыўным і багатым духоўным жыццём, — падзялілася сваімі ўражаннямі Ніна Сямёнаўна Гаўрылава, якая ўпершыню пабывала на свяце Баркалабаўскага абраза. — Гэта жыццё змяшчае ў сабе не толькі імкненне патрапіць на канцэрт моднага выканаўцы, але і шанаванне святыняў нашай дзяржавы, памяць пра нашых продкаў і даніну павагі ўсяму, што рабілася да нас. Я абавязкова падыду да абраза, каб папрасіць для краіны міру і спакою, а для сяброў і сваякоў — здароўя. І веру, што гэта абавязкова спраўдзіцца.

Епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім звярнуў увагу людзей, што юбілей цудатворнага Баркалабаўскага абраза адзначаецца ў Год роднай зямлі, калі ўсе імкнуцца захаваць і памножыць духоўныя багацці беларускага народа.

— Сёння мы звяртаемся са шчырай малітвай да старажытнага абраза Божай Маці, каб яна памілавала нас і захавала наш край, — сказаў уладыка Серафім. — Няхай Баркалабаўскі абраз, які захаваўся праз стагоддзі і ліхалецці, сапраўды захоўвае нашых людзей, нагадвае ім пра вечныя духоўныя багацці народа.





Падчас святкаванняў юбілею ў Быхаве адбыліся канцэрт самадзейных калектываў і выступленне вайсковага аркестра, прайшлі выставы народнай творчасці і праваслаўнай літаратуры. Вялікі кірмаш у свята Баркалабаўскага абраза Божай Маці — гэта старажытная традыцыя, якую імкнуцца адрадзіць на Быхаўшчыне.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Быхаўскі раён.*

На слыху

## ПРЫПЫНЕННЕ ВАЛЮТНАГА КРЭДЫТАВАННЯ ЗНІЖАЕ РЫЗЫКІ НЕВЯРТАННЯ КРЭДЫТАЎ

**«Звязда» ўжо паведамляла пра тое, што Нацыянальны банк Беларусі сваёй пастановай да 1 студзеня 2011 прыпыняе выдачу фізічным асобам, за выключэннем індывідуальных прадпрымальнікаў, крэдытаў у замежнай валюце. Паводле меркавання спецыялістаў галоўнага банка краіны, гэта дазволіць знізіць рызыкі як для банкаў (у выпадку несвоечасовага пагашэння, альбо невяртання крэдыту), так і для насельніцтва.**

Як адзначыў **намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацбанка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ,** адмова ад разлікаў у замежнай валюце паміж рэзідэнтамі на тэрыторыі нашай рэспублікі з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў па дэдаларызацыі эканомікі. На думку банкіраў, гэта паспрыяе абароне і забяспечыць устойлівасць нацыянальнай валюты, у тым ліку яе пакупной здольнасці і курса ў адносінах да замежных валют, узмоцніць давер да беларускага рубля.

— Улічваючы, што грамадзяне рэспублікі атрымліваюць зарплату ў беларускіх рублях, а таксама магчымыя хістанні ўзаемных курсаў замежных валют на аддаленую перспектыву, — падкрэсліў наш суразмоўца, — крэдытаванне насельніцтва ў замежнай валюце ўтрымлівае вялікую валютную рызыку і рызыку непагашэння такіх крэдытаў у выпадку, калі сумы плацяжоў па іх павялічацца да памераў, што перавышаюць даходы крэдытаатрымальніка.

Разам з тым, у Нацбанку акцэнтуюць увагу на тым, што абмежаванні на крэдытаванне ў валюце будуць часовымі, яны будуць дзейнічаць да моманту стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы. Забарона на крэдытаванне фізічных асобаў у валюце ўвойдзе ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання пастановы. Прычым абмежаванні пры авердрафтным крэдытаванні ўвойдуць у сілу праз месяц пасля афіцыйнага апублікавання.

А вось на вяртанне (пагашэнне) крэдытаў, што былі атрыманыя фізічнымі асобамі да ўваходжання ў сілу пастановы, часовае абмежаванне на крэдытаванне ў валюце не распаўсюджваецца. Вяртанне (пагашэнне) такіх крэдытаў, плата працэнтаў і плата за карыстанне імі, калі прадугледжана крэдытным дагаворам, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з крэдытным дагаворам і заканадаўствам.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## «ПАЛІМІР» НЕ МАЕ ДАЧЫНЕННЯ ДА ЎЦЕЧКІ ХІМІКАТАЎ У РЫЖСКІМ ПОРЦЕ

**Да ўцечкі хімікатаў у Рыжскім порце беларускі завод «Палімір» не мае дачынення. Пра гэта заявілі на прадпрыемстве.**

Наваполацкі завод «Палімір» ААТ «Нафтан» у адпаведнасці з кантрактам адправіў латвійскай фірме Biolar ацэтонцыянгідрын у цыстэрнах. «Прадукт быў дастаўлены з Наваполацка ў цыстэрнах на станцыю прызначэння — Олайне (горад пад Рыгай). З нашага боку была забяспечана пастаўка якаснага прадукту ў нармальных цыстэрнах. Усе свае абавязкі перад Biolar мы выканалі, і пытанняў ніякіх не ўзнікла», — падкрэслілі на «Паліміры».

Пасля дастаўкі ацэтонцыянгідрыну ў Олайне ўласнікам гэтай прадукцыі стала фірма Biolar, якая і ажыццяўляла з ёю далейшыя аперацыі — пераліў у свае кантэйнеры і далейшую адпраўку ў порт. Кантэйнер, з якога адбылася ўцечка ў Рыжскім порце, належаў латвійскай фірме. «Інфармацыя аб тым, што кантэйнер прыбыў у Рыгу з «Паліміра» — ілжывая. На адрас Biolar мы адпраўлялі ацэтонцыянгідрын толькі ў цыстэрнах. Прадукцыя адпавядала якасці», — яшчэ раз падкрэслілі на заводзе. Спецыялісты адзначылі таксама, што «Палімір» экспартуе ацэтонцыянгідрын ужо шмат гадоў, і ніколі якіх-небудзь інцыдэнтаў не ўзнікала.

Як паведамлялася, у ноч на 23 ліпеня ў адным з кантэйнераў у Рыжскім порце пачалася некантралюемая рэакцыя хімічных рэчываў, у выніку чаго адбылася ўцечка ацэтонцыянгідрыну — бясколернага рэчыва, якое з'яўляецца вельмі таксічным. Работнікі порта выявілі ўцечку толькі раніцай. Усю раніцу пажарныя ахаладжвалі кантэйнер і спрабавалі збіць ціск унутры яго. Жыхары блізкіх раёнаў латвійскай сталіцы былі эвакуяваныя. Пашкоджаны кантэйнер паспяхова вывезены за межы Рыгі і дастаўлены ў горад Олайне на прадпрыемства Biolar, якое з'яўляецца ўласнікам таксічнага рэчыва.

У Дзяржаўнай пажарна-выратавальнай службе Латвіі паведамілі, што верагоднай прычынай уцечкі ядавітага рэчыва ацэтонцыянгідрыну ў Рыжскім порце з'яўляецца непрамыты кантэйнер. Разам з тым кіраўніцтва прадпрыемства Biolar заявіла прэсе, што кантэйнер, з якога адбылася ўцечка таксінаў, прыйшоў з беларускага Наваполацка, з прадпрыемства «Палімір».

**Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.**

## НОВАЕ АМПЛУА СВЯТЛАНЫ СУХАВЕЙ

*Чалавек ад культуры ў парламенце лабіруе інтарэсы творцаў*



Фота Віктара ЗАЙКОЎСКАГА.

**Калі вы чытаеце інтэрв'ю са Святланай Сухавей, значыць, парламенцкаму карэспандэнту «Звязды» пашанцавала. Заслужаная артыстка Беларусі, абраная дэпутатам на мінулых парламенцкіх выбарах, не тое каб не любіць даваць інтэрв'ю — яна стараецца іх пазбягаць. З-за шчыльнага графіка ды з-за таго, што піяру ёй і без таго хапае — дэпутата і цяпер можна пабачыць, толькі ў іншым амплуа — актрысы — на экранах і на сцэне Тэатра-студыі кінаакцёра (яна іграе ў спектаклях «Мы ідзём глядзець Чапаева», «Пігмаліён», «Галубчык», «Выкраданне Алены», «Навек у памяці», «Заноза», «Шчаўкунчык» — многія з іх вы зможаце паглядзець у новым тэатральным сезоне). Аднак тут сышліся зоркі, ва ўсіх сэнсах: абедзве мы па гараскопе — скарпіёны, і дэпутатам Святлана Іванаўна абраная ад «маёй» акругі — мінскай Масюкоўшчынскай.**

### Клопат пра аўтараў — на авансцэне

Лагодная і далікатная манера гаварыць, гэтыя пастаянныя памяншальна-ласкальныя суфіксы ў гутарцы, прыемны меладычны голас прафесійнай актрысы аказваюць на мяне рэлаксуючы эфект, і пад «гіпнозам» яе мяккіх жэстаў я ледзь не забываюся, чаго прыйшла... Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе цяпер працуе над папраўкамі ў закон аб аўтарскім праве і сумежных правах. Прычым не толькі як дэпутат профільнай камісіі, але і як распрацоўшчык — Святлану Сухавей запрасілі ў рабочую групу па падрыхтоўцы законапраекта. Чакаецца, што ён паступіць на разгляд парламентарыяў ужо на пачатку наступнага года. А пакуль дыскусіі ў самым разгары. Чыноўнікі і творцы мадэлююць сітуацыі, якія могуць узнікнуць з прыняццем той ці іншай нормы, і спрабуюць прыйсці да кансэнсусу.

— Аўтары часта скардзяцца, што не заўсёды яны атрымліваюць узнагароджанне, прадугледжанае дзейным законам. Механізм часам не спрацоўвае, — зазначае «мой» дэпутат. Вось беларускія заканадаўцы і ўзяліся расставіць усе кропкі над «і».

Новы нарматыўны акт цікавіць фактычна ўсіх творцаў — столькі сфераў ён ахоплівае.

— З'явілася магчымасць палепшыць становішча вельмі шырокага спектра аўтараў — пісьменнікаў, мастакоў, тэатральных дзеячаў, музыкантаў, кампазітараў, кінематаграфістаў, сцэнарыстаў і шмат якіх іншых, у тым ліку і тых, хто валодае сумежнымі правамі, напрыклад, выканаўцаў і вытворцаў фанаграм, — кажа Святлана Сухавей.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# АДКУЛЬ ПАЛЬМАВЫ АЛЕЙ У БЕЛАРУСІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### «Прыхапіць» заводы не атрымаецца

Адзін з прысутных расійскіх журналістаў спытаў: ці не думаюць у нас даць магчымасць расіянам прыватызаваць шэраг малочных заводаў і тым самым палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі?

— За капейкі нікому не ўдасца купіць нашы малочныя прадпрыемствы. А вось інвестыцыям мы будзем рады, — сказаў міністр. Па яго словах, Беларусі сёння вельмі патрэбны сучасны завод па перапрацоўцы прыкладна двух мільёнаў тон малака. І краіна паходжання інвестыцый тут — не прынцыповае пытанне. Галоўнае, каб яны працавалі на эканоміку нашай краіны. Будуць гэта расійскія грошы — калі ласка. Тым больш, што ў малочнай галіне ўжо працуе нямала расійскіх грошай.

### Няпоўнагадовым не месца на камбайнах

На пытанне расійскага калегі аб тым, што думае міністр наконт прыцягнення замежнай працоўнай сілы, Сямён Шапіра адказаў, што цяпер для яго найважнейшае пытанне, як загрузіць пастаянай рабочай сілай сваіх людзей. А ўвогуле у Беларусі хапае працоўнай сілы ў вёсцы, хоць у асобных мясцовасцях адчуваецца яе дэфіцыт. Разам з тым ён назваў скарачэнне сельскага насельніцтва «нармальным працэсам», бо ў вёску прыходзіць новая тэхніка. Сёння адна машына можа замяніць дзясяткі касцоў. Хоць і няма нічога экстраардынарнага ў прысутнасці ў краіне замежнай працоўнай сілы, ёсць у нас адпаведнае заканадаўства. Затое міністр супраць таго, каб няпоўнагадовыя працавалі на ўборцы на камбайнах, бо гэта вядзе да дзіцячага траўматызму.

### Мільён тон збожжа застанецца дома

З мінулага ўраджаю у Беларусі застаўся мільён тон збожжа. Прададуць яго на экспарт? — спыталі ў міністра.

— Не, — адказаў Сямён Барысавіч, — самім спатрэбіцца. Бо віды на бягучы ўраджай збожжавых пакуль няпэўныя, хоць хлебаробы вырасцілі, па папярэдніх разліках, як і летась, каля 10 мільёнаў тон збожжавых. Праўда, моцныя дажджы і вецер паклалі на зямлю нямала збожжа. Узняць яго вельмі няпроста. Таму леташні мільён тон можа аказацца да месца. А ўвогуле, па словах Сямёна Шапіры, трэба лепш гандляваць гатовай прадукцыяй: малочнай, мясной, а не збожжам.

### У нас не змешваюць пальмавы алей з малаком

Сямён Шапіра абверг усялякія чуткі і домыслы аб ненатуральнасці сухога малака. Каб атрымаць кілаграм гэтага прадукту, трэба выдаткаваць 10 літраў звычайнага малака. Потым, калі ў ім узнікне патрэба, варта па тэхналогіі «ажывіць» сухое малако ці, інакш кажучы, дадаць вільготнасці, і малако будзе выкарыстоўвацца як свежае. Вельмі зручна, асабліва для Расіі, дзе зімой традыцыйна не хапае малака і там вымушаны назапашваць сухое малако, у тым ліку і за кошт імпарту з Беларусі. З Расіяй, па словах Сямёна Шапіры, дасягнута дамоўленасць аб тэрмінах і аб'ёмах паставак нашага сухога малака, каб не было непаразуменняў і непатрэбнай канкурэнцыі.

На думку Сямёна Шапіры, беларускае сухое малако ні ў якім разе нельга называць сурагатам, штучным прадуктам, як гэта нядаўна спрабавалі зрабіць асобныя расійскія журналісты. Таму міністр з гумарам адгукнуўся аб дзіўных выказваннях аднаго з кіраўнікоў Малочнага саюза Расіі. Ён дагаварыўся да фантастычных рэчаў, маўляў, беларусы набылі вялікую партыю пальмавага алею, змешваюць яго з малаком і потым пасля адпаведнай апрацоўкі прадаюць даверлівым расіянам пад выглядам сухога малака. «Пакажыце мне, дзе ў нас гандлююць пальмавым алеем у значных аб'ёмах? — спытаў міністр прысутных і адказу не пачуў.

### З лёнам не развітваемся

Якія перспектывы льнаводства? На гэтае пытанне міністр адказаў даволі аптымістычна: яно будзе існаваць насуперак розным размовам. Гэта наша гісторыя, наша традыцыя, наша нацыянальная рыса. Таму льнаводства захаваецца і будзе развівацца, з часам лён стане важнай часткай сельскагаспадарчага экспарту. Але для гэтага трэба шмат папрацаваць. Намечаны меры па вывадзе льнаводства на перадавыя рубяжы, у прыватнасці, мадэрнізацыя Аршанскага льнокамбіната.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ГРАБОЎСКІ І КАСЦІЦЫН АДМОВІЛІСЯ АД ПУБЛІЧНАГА ПРЫМІРЭННЯ

## Але заверылі журналістаў, што канфлікт вычарпаны

**Зоркі НХЛ Руслан Салей, Міхаіл Грабоўскі і Сяргей Касціцын сустрэліся з юнымі беларускімі хакеістамі. Карыстаючыся адпачынкам НХЛаўцаў, трэнерскі штаб нацыянальнай зборнай на чале з Гленам Хэнланам сабраў іх у Мінску і даў апошнія настаўленні перад стартуючым сезонам. А затым гульцы разам з галоўным трэнерам і старшынёй федэрацыі хакея Уладзімірам Навумавым у канферэнц-зале Дома футбола адказалі на пытанні юных аматараў хакея.**



Міхаіл ГРАБОЎСКІ.



Сяргей КАСЦІЦЫН.

9—12-гадовых хлопцаў цікавілі самыя розныя аспекты з жыцця хакеістаў НХЛ. У Руслана Салея не маглі не запытаць, як стаць выдатным абаронцам. — Дарэчы, складанае пытанне, — адказаў Руслан, на хвіліну задумаўшыся. — Займацца мэтанакіравана, імкнуцца да большага, станоўча глядзець на няўдачы. Нейкага асаблівага сакрэту няма — мэтанакіраванасць і любоў да свайго віду спорту, — зрабіў заключэнне хакеіст. У Сяргея Касціцына пацікавіліся, ці часта ён спрачаецца з трэнерам. Сяргей падкрэсліў, што ніколі не спрачаецца. «Спрачацца з трэнерам не трэба, яго трэба слухаць». У Міхаіла Грабоўскага спыталі, у колькі гадоў ён упершыню стаў на лёд. Нападаючы «Таронта» адказаў: «У 4,5 года тата прывёў мяне на каток. У вашым узросце, у 9 гадоў, я лічыў сябе дарослым, і добрым хакеістам. У нас, праўда, не было такой магчымасці кантактаваць з дарослымі хакеістамі. Мы проста назіралі за гульнямі «Цівалі» іншых клубаў».

Запыталі ў хакеістаў і пра іх стаўленне да жаночага хакея, на што ўсе трое адказалі, што нічога супраць не маюць. Дзяцей і бацькоў цікавілі і прафесійны падыход да трэніровак і харчавання. Галоўны трэнер Глен Хэнлан прызнаўся, што яго шасцігадовы сын ужо спыніў заняткі хакеем, бо гэта стала яму нецікава. «Галоўнае ў такім узросце — каб трэніроўкі падабаліся, каб дзеці пакідалі іх з усмешкай. Дзецям патрэбны рух. Паглядзіце на гульню Сяргея, Міхаіла, як яны абыходзяць абаронцаў, падманваюць суперніка — гэта вынік іх працы над сабой. Рабіце, паўтарайце тое, што вам падабаецца», — параіў галоўны трэнер. Міхаіл Грабоўскі параіў юным хакеістам надаваць увагу лядовай падрыхтоўцы, працаваць з клюшкай. «Мне зараз не хапае моцы кідка. Працуйце над кідком».

Некаторыя дзіцячыя пытанні ставілі хакеістаў у тупік. Не маглі не ўзгадаць дзеці пра канфлікт Сяргея Касціцына і Міхаіла Грабоўскага. На працягу рэгулярнага чэмпіянату НХЛ у адной з сустрэч сваіх камандаў «Манрэаля» і «Таронта» паміж гульцамі ўзнікла, мякка кажучы, непаразуменне (Касціцын-малодшы жорстка атакаваў Грабоўскага, сустрэўшы яго зацiснутай у руках клюшкай у твар), якое ледзь не скончылася сапраўднай бойкай. Працягнулася яно потым перапалкай у СМІ. Балельшчыкі чакалі наступнай сустрэчы «Таронта» з «Манрэалем» з падвоенай цікавасцю. І матч таксама ледзь не скончыўся бойкай, аднак арбітр захаваў кантроль над сітуацыяй. Прымірыць гульцоў нацыянальнай зборнай паабяцалі арганізатары сустрэчы. Адзін з юных хакеістаў так і папрасіў: «Міхаіл, вы не маглі б устаць і абняць Сяргея». Міхаіл Грабоўскі спачатку адказаў жартам: «У зале занадта шмат дзяўчат, абдымацца мы не будзем». І паабяцаў гэта зрабіць на першай сустрэчы іх клубаў у наступным сезоне. Просьбу пацiснуць адзін аднаму рукі Грабоўскі адмёў больш катэгарычна: «Давайце хакейныя пытанні». А пасля Міхаіл растлумачыў журналістам, што канфлікт паміж ім і Сяргеем даўно вычарпаны, яны сустракаліся ў Мінску раней, і перад гэтай сустрэчай пацiснулі адзін аднаму рукі. Дарэчы, гэтую просьбу юнага хакеіста ў футболцы «Таронта» Руслан Салей прызнаў лепшым пытаннем ад балельшчыкаў.

Напрыканцы сустрэчы юныя хакеісты атрымалі аўтографы ад сваіх куміраў і мелі магчымасць з імі сфатаграфавацца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ІМЧЫЦЬ, ІМЧЫЦЬ АЎТАМАБІЛЬ,

## *альбо Некаторыя заканамернасці дарожна-транспартных здарэнняў*

**Калі на гэтым перакрыжаванні аўтаавары́й больш чым на іншых, то, напэўна, на тое ёсць свае прычыны? А чаму менавіта ў гэты дзень найбольш здарэнняў з удзелам аўтамашын?**

Кожны вадзіцель за сваё жыццё дапускаў парушэнні правілаў руху. Не тое каб ехаць на чырвонае вока святлафора, але бывае... Але калі п'яны садзіцца за руль, то тут апраўдання няма.

За першую палову 2009 года на Брэстчыне з 327 ДТЗ 49 прыпадае на п'яных вадзіцеляў і калі па іх віне адбываецца аварыя ці наезд, то гэта не выпадковасць. Вялікі працэнт і тых, хто кіраваў аўтамашынай без дакументаў ці быў пазбаўлены правоў. Іх віна ў аўтатранспартных здарэннях таксама вялікая.

У Баранавічах аднаго вадзіцеля суд аштрафаваў на 14 млн рублёў за тое, што ён сем разоў на працягу няпоўнага года затрымліваўся за кіраванне аўтамабілем без дакументаў на ваджэнне.

Найбольшая колькасць ДТЗ прыпадае на суботу, амаль 19 % ад усіх. У гэты дзень на дарогах знаходзіцца найбольш машын. Людзі едуць на дачы, у лес, бліжэй да вады...

А вось у сераду здарэнняў з удзелам вадзіцеляў найменш, тым не менш, на Брэстчыне, як і ў мінулым годзе, менавіта на гэты дзень прыпадаюць аўтааварыі з самымі цяжкімі наступствамі. З чым гэта звязана — растлумачыць цяжка, але нейкая прычына ёсць. Магчыма, сярод тыдня вадзіцелі расслабляюцца, губляюць асцярожнасць...

Найчасцей дарожна-транспартныя здарэнні адбываюцца ў населеных пунктах, на іх прыпадае амаль 65 %, а астатнія на аўтамагістралях і дарогах за межамі гарадоў і вёсак. Дарэчы, у вёсках вобласці здарэнняў столькі ж, як і ў абласным цэнтры — больш за 17 працэнтаў. Але ж хіба Брэст па інтэнсіўнасці руху можна параўнаць з усімі вёскамі? У сельскай мясцовасці менш кантролю і больш разгільдзяйства.

На аўтамагістралях рэспубліканскага значэння аўтааварыі найбольш цяжкія, амаль палова людзей загінула там, хоць колькасць ДТЗ на аўтамагістралях — толькі 24 працэнты ад зарэгістраваных у вобласці. Цяжкія аварыі на аўтамагістралях звязаныя з тым, што транспарт там рухаецца на высокай хуткасці, а сутыкненні найчасцей лабавыя. З усіх гарадоў Брэстчыны самае складанае становішча з дарожна-транспартнымі здарэннямі ў Кобрынскім раёне. І калі па вобласці аварыйнасць зменшылася, то на Кобрыншчыне яна вырасла. Але дастаткова зірнуць на карту, каб адзначыць, што праз гэты раён пралягае найбольшая колькасць магістральных дарог і дарог рэспубліканскага значэння. Інтэнсіўнасць руху аўтатранспарту непасрэдна ўплывае на аварыйнасць.

Вось па тэлебачанні паказалі аварыю ў Германіі. Там на аўтамагістралі сутыкнуліся больш за 200 машын. Калі траса перагружаная, машыны ідуць патокам і на высокай хуткасці, то дастаткова аднаму вадзіцелю націснуць на тормаз, як спрацоўвае эфект даміно.

Найбольш ДТЗ звязана з пешаходамі, а ўжо на другім месцы — сутыкненне транспарту. Скажу, што да гараджан асаблівых прэтэнзій няма — людзі стараюцца перасякаць вуліцы на пераходах, хоць адступленняў хапае. А вось вясковыя жыхары, найперш маладыя, здараецца, ідуць па вуліцы ад плота да плота і на сігнал — нуль увагі.

Вялікую праблему ствараюць веласіпедысты. Бывае, не хочуць ехаць па краі дарогі адзін за адным, а едуць — плячо ў плячо. Пажылыя ж часта ўвогуле не прытрымліваюцца ніякіх правілаў руху. Не дзіўна, што з усіх ДТЗ наезды на веласіпедыстаў складаюць больш за 35 % — самы высокі працэнт ад усіх дарожна-транспартных здарэнняў, зарэгістраваных па вобласці.

Калі веласіпедыст рухаецца не па спецыяльнай дарожцы, а па праезнай частцы дарогі, то ён абавязаны, як і вадзіцель аўтамашыны, выконваць правілы руху.

Пасля веласіпедыстаў найбольш небяспечныя перакрыжаванні дарог. Размінуцца тут, нават калі перакрыжаванне рэгулюецца святлафорам, бывае няпроста. А некаторыя перакрыжаванні набылі славу фатальных. У кожным горадзе такія ёсць. Але ў аварыях вінаватыя, вядома ж, не перакрыжаванні, а вадзіцелі. Колькі разоў даводзілася бачыць, як аўтамашына праскаквала перакрыжаванне ў апошні момант — на жоўтае святло.

Адным словам, няма зачараваных месцаў, а ўсё завязана на чалавечым фактары. На жаль, у многіх ДТЗ гінуць і атрымліваюць раненні людзі, не вінаватыя ні ў чым, але гэта даніна цывілізацыі...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Абзац

◢ Акцыя па аснашчэнні ўрачоў першаснага звяна глюкометрамі стартавала ў Віцебску. Учора ў паліклініцы № 3 абласнога цэнтра адбылася першая перадача ўрачам экспрэс-вымяральнікаў канцэнтрацыі цукру ў крыві. Цяпер яны могуць праводзіць аналіз прама на прыёме без накіравання пацыентаў у лабараторыю. 50 апаратаў перададзеныя расійскім прадпрыемствам «Элта», якое выступіла спонсарам акцыі. Мяркуецца забяспечыць такімі прыборамі і іншыя паліклінікі горада.

◢ **Непрацуючы 36-гадовы жыхар вёскі Лешня быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі пры збыце 470 патронаў да аўтамата Калашнікава. Таксама ў Гомельскай вобласці супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі ў 58-гадовага жыхара вёскі Валосавічы Акцябрскага раёна самаробны карабін і 14 патронаў да яго. Зброя была прыстасавана для стральбы малакаліберным патронамі. Заведзены крымінальныя справы.**

◢ Брытанскія фізікі распрацавалі незвычайную сістэму, якая здольная падаваць электрычнасць са звычайнай разеткі без якіх бы там ні было правадоў. Па словах распрацоўшчыкаў, сістэма грунтуецца на базавых законах фізікі і можа быць выкарыстана для бесправадной падачы электрычнасці на самыя разнастайныя хатнія прыстасаванні. Такім чынам яна можа дапамагчы пазбавіць мільёны дамоў і офісаў ад соцень тысяч кіламетраў правадоў і мноства акумулятараў. У аснове прынцыпу дзеяння ўстаноўкі ляжыць прынцып рэзанансу. Устаноўка не прыносіць шкоды здароўю чалавека.

## Поўны абзац

◢ **У Кэдмене, што ў амерыканскім штаце Н'ю-Джэрсі, дзесяцігадовае дзіця, пагражаючы пісталетам, адабрала скейтборд у 11-гадовага хлопчыка. Падазроны быў затрыманы паліцыяй непадалёк ад месца здарэння. Пісталет у яго быў самы сапраўдны. Высвятляецца, як ён трапіў да дзіцяці.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 3 (трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**лот 1** — земельный участок в а/городке Раков, площадь участка 0,1464 га, участок № 14, кадастровый номер участка 622085715640000012, начальная цена 14 640 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется поблизости газ;

**лот 2** — земельный участок в а/г Раков, площадь участка 0,1451 га, участок № 15, кадастровый номер участка 622085715640000013, начальная цена 14 510 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется поблизости газ;

**лот 3** — земельный участок в деревне Дубоши, площадь участка 0,1561 га, кадастровый номер участка 622085705601000043, начальная цена 7 805 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 10 километров, находится в начале населенного пункта, на границе участка имеется искусственный водоем, электричество, асфальтированный подъезд.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь постоянно проживающим на территории Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **28 августа 2009 года** в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 24 августа 2009 года (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36; 8 029 1405437.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ І УКРАІНА ЎВАЙШЛІ Ў ПЯЦЁРКУ СУСВЕТНЫХ ЛІДАРАЎ ПА ІНФЛЯЦЫІ

**У пяцёрку краін, у якіх у чэрвені тэмпы росту коштаў былі найболей значнымі, увайшлі Украіна, Расія, ЗША, Нарвегія і Люксембург. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы Расстата, які параўнаў дынаміку тэмпу росту коштаў у асноўных эканоміках свету.**

Лідарам сусветнага спіса стала Украіна — у гэтай краіне спажывецкія кошты за месяц выраслі на 1,1 % у параўнанні з маем. У ЗША гэты паказчык склаў 0,9 %, у Люксембургу — 0,7 %, а ў Расіі і Нарвегіі — па 0,6 %.

У шэрагу краін, напрыклад, у прыбалтыйскіх дзяржавах, Паўднёвай Карэі, Грэцыі, Галандыі і Бельгіі зарэгістраваная дэфляцыя — у чэрвені 2009 года цэны ў гэтых краінах зніжаліся, а не раслі.

Варта адзначыць, што калі параўноўваць не месячныя паказчыкі інфляцыі, а паўгадавыя, то першае месца займае таксама Украіна — 8,6 %. На другім месцы ідзе Расія — 7,4 %. У ЗША кошты за паўгода выраслі толькі на 2,6 % .

З-за эканамічнага крызісу рост коштаў на тавары і паслугі ў большасці краін свету стаў паступова запавольвацца, а ў некаторых краінах прывёў да дэфляцыі. Прычына ў тым, што попыт на тавары ўпаў, з-за чаго вытворцы змушаныя былі праводзіць распродажы і зніжаць кошты.

Цікава, што паводле звестак таго ж Расстата, у першым паўгоддзі прадукты харчавання ў Расіі даражэлі ў 23 разы хутчэй, чым у Еўропе.

### АХВЯРАМІ ЎРАГАНУ Ў ЧЭХІІ І ПОЛЬШЧЫ СТАЛІ НЕ МЕНЕЙ ЗА ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК

**У выніку ўрагану на тэрыторыі Чэхіі і Польшчы, які пачаўся ў чацвер увечары, загінулі як мінімум шэсць чалавек, паведамляе AFP.**

Паводле інфармацыі агенцтва, чатыры чалавекі на тэрыторыі Польшчы былі забітыя дрэвамі, якія ўпалі з-за ветру, хуткасць якога дасягала 100 км у гадзіну, адзін чалавек патануў. Дзясяткі людзей атрымалі розныя траўмы. 17 чалавек атрымалі ўдары токам ад абарваных ветрам ліній электраперадач. У Чэхіі загінула 75-гадовая жанчына.

### У РАСТОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ БЕНЗАВОЗ СУТЫКНУЎСЯ З РЭЙСАВЫМ АЎТОБУСАМ: ДЗЯСЯТКІ ЗАГІНУЛЫХ



У Растоўскай вобласці бензавоз КамАЗ сутыкнуўся з аўтобусам «Ікарус» (паводле іншай інфармацыі, Mercedes), па звестках на момант вёрсткі нумара, загінуў 21 чалавек, яшчэ дзевяць атрымалі раненні. ДТЗ адбылося каля апоўдні на трасе Растоў—Краснадар, у раёне пасёлка Самарскае.

# ДОБРА МЕЦЬ ДАМОК У ВЁСЦЫ

**Рана ці позна мары пра жыццё на ўлонні прыроды прыходзяць да кожнага гараджаніна. Стамляешся ад пылу, мітусні, вечнага змагання за месца пад сонцам. Хочацца цішыні і спакою. Часцей пра такое думаецца ў канцы вясны. І калі лета на рынку гарадской нерухомасці — час зацішша, то для загараднай — самы гарачы сезон. Больш за ўсё дагавораў куплі-продажу зямельных участкаў, дач, загарадных дамоў заключаюць у ліпені.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Самы пік пакупак на рынку загараднай нерухомасці прыпадае на ліпень, — кажа **дырэктар агенцтва нерухомасці «Загарадны дом» Уладзімір ЧАРНУШЭВІЧ.** — У гэты час прадавец разумее, што трэба быць больш згаворлівым і зніжае цану, бо наступны «дачны бум» пачнецца толькі ў маі. Ды і пакупнік да гэтага часу ведае, што танна, што дорага — адным словам, добра «падкаваны» і разумее сітуацыю.

На сёлетні сезон вельмі паўплываў вядомы фінансавы крызіс. Той, хто марыў пра свой дамок за горадам, гэтаму толькі парадаваўся: цэны істотна ўпалі. Калі летась прадавец дачы, крыху далажыўшы грошай, мог спакойна набыць неблагую кватэру ў Мінску, то сёння гэта зрабіць цяжка. Праўда, летась выбар загараднай нерухомасці быў большы, а сёлета прапановы скараціліся амаль удвая. Але і цяпер у тыдзень прадаецца па 4-5 дач, у базе звестак агенцтва «Загарадны дом» — каля 850 аб'ектаў.

Некаторыя прадаўцы вырашылі дачакацца больш спрыяльных часоў для продажу і таму прытрымліваюць сваю ўласнасць. Калі раней дача выкарыстоўвалася больш для адпачынку (пасмажыць з сябрамі мяса, паваляцца на траўцы), то ў апошні час усё часцей людзі прыходзяць да думкі, што найлепшы спосаб яе выкарыстання — для атрымання ўраджаю з агарода ці саду. Для многіх гэта — добрая падмога для патаннення свайго жыцця. Гурочкі ды яблычкі са свайго падворка дазваляюць не так хутка танчэць кашальку, калі ідзеш па пакупкі.

Цэны на дачы пачалі падаць яшчэ да крызісу. Летам гэты працэс крыху спыніўся. І тым не менш і цяпер неблагую дачу ў межах 20 кіламетраў ад МКАД можна набыць за 25—30 тысяч долараў.

Вылучаецца два віды дач. Першы — дача ў садовым таварыстве. Гэта шэсць сотак, невялікі, звычайна аднапакаёвы дамок 5-6 «квадратаў», сезонная вада і суседзі, якія з задавальненнем раскажуць пра новы рэцэпт засолкі агуркоў, падзівяцца вашаму небываламу ўраджаю клубніц і страшна надакучаць вам за ўвесь дачны сезон. Каштуюць такія дамкі ад 10 тысяч долараў ЗША і вышэй. Цана залежыць ад аддаленасці дачы ад МКАД, стану дома. Шчытавыя дамкі таннейшыя, а дабротныя каштуюць дорага.

Другі тып дач — дамок у вёсцы. Зямлі там значна больш, сотак 15—20, ёсць свой сад. На рынку загараднай нерухомасці попыт на вясковыя дамкі сёння павысіўся. І прычына тут не толькі ў сотках. Такія дачы больш адасобленыя, чалавек адчувае сябе там свабодна, не пад такім пільным поглядам суседзяў, як у садовым таварыстве. А калі недалёка ад дома ёсць рэчка ды лес — гэта ўвогуле мяжа мараў.

Але мінусы таксама ёсць. Хто жыў ва ўласным доме, ведае, колькі ён патрабуе клопату, няспыннай працы. То плот пакасіўся і трэба яго рамантаваць ці ставіць новы, то дах састарэў і вось-вось пачне працякаць, то яшчэ якая навала нападзе. У асноўным жа дамкі ў вёсцы прадаюцца не новыя, а такія, якія паслужылі некаму не адзін дзясятак гадоў, таму і турбот, звязаных з такімі дачамі, не пазбегнуць.

Дамы ў вёсцы каштуюць ад 5 тысяч і вышэй, зноў жа, у залежнасці ад стану, навакольнай прыроды, аддаленасці ад сталіцы. Калі дом добры, маляўнічая прырода навокал, да таго ж маецца вялікі надзел зямлі, то кошт можа дасягаць і 40 тысяч. Асабліва цікавяцца пакупнікі нерухомасцю ў Лагойскім, Ракаўскім, Маладзечанскім напрамках. А вось Магілёўскі не асабліва карыстаецца попытам. Там і дач менш, і прырода не такая натхняльная.

Людзі часцей набываюць дачы, дамкі ў вёсцы, каб мець магчымасць вярнуцца да зямлі, да прыроды. Той, хто пастаянна жыве ў горадзе, стамляюцца ад яго, таму гатовыя плаціць грошы, каб мець сваё «прыстанішча» на ўлонні прыроды, адпачываць, хоць на выхадных, і душой, і целам ад «каменных джунгляў». Для такіх аматараў прыроды няма большай асалоды, чым босымі прайсціся па расе, паслухаць, як заліваюцца птушкі, стракочуць конікі ў траве.

Як правіла, дачу ў вёсцы набываюць людзі ва ўзросце, якія разумеюць, што наўрад ці пабудуюць уласны дом. Матывы пакупкі — пажыць для сябе, адпачыць душой, мець магчымасць паехаць з горада на 3-4 дні, парыбачыць.

Моладзь цікавіцца набыццём дач не часта, калі і купляе дом, то звычайна ў вёсцы, з разлікам на тое, што пазней там будуць жыць бацькі.

Асаблівасць сёлетняга сезона — цікавасць да зямельных участкаў. Калі раней іх і прапаноўвалі, і куплялі не шмат, то цяпер гэтыя працэсы ідуць больш актыўна. Кошт зямельнага ўчастка — ад 15 тысяч долараў ЗША і вышэй. Як заўсёды, больш запатрабаванымі застаюцца танныя надзелы. А вось попыт на дарагую зямлю паменшыўся, хоць цэны на яе ўпалі амаль удвая.

Найбольшым попытам карыстаюцца ўчасткі па 15—25 сотак за 20—30 кіламетраў ад Мінска па цане каля 35 тысяч долараў.

Значна ўпаў інтарэс на гатовыя катэджы пад апрацоўку. Цэны на іх знізіліся на 20 % і больш. Сёння набыць такі катэдж можна танней, чым пабудаваць дом «з нуля».

Яшчэ год таму мінчане з ахвотай прадавалі свае гарадскія кватэры і набывалі дамы ў прыгарадзе. Такія здзелкі складалі да чвэрці ўсіх здзелак куплі-продажу дамоў. Хутка стала зразумела, што сумяшчаць работу і жыццё ў аддаленым доме цяжка. Цяпер людзі прыходзяць з пажаданнямі набыцця дамка каля Мінска, у ціхім маляўнічым месцы. Але цяжка выканаць такую просьбу. Як правіла, дамкі ў жывапісным месцы знаходзяцца далёка ад Мінска, а калі і ёсць такія бліз сталіцы, то яны вельмі дарагія.

Бывае, што людзі набываць дачы не праз агенцтва, а знаходзяць аб'явы аб продажы ў газетах ці інтэрнэце. Вось і Зінаіда Антонаўна набыла сваю загарадную нерухомасць такім жа спосабам: вычытала ў спецыялізаваным выданні, што прадаецца зямельны надзел з недабудаваным домам. Жанчына нарадзілася і вырасла ў вёсцы і марыла пра свае ўласныя градкі ды невялікі дамок даўно, таму паспяшалася звязацца з гаспадарамі. Гэтая нерухомасць тады, у 2006 годзе, каштавала 4 мільёны бел. рублёў, на той час — 1100 долараў. Зямля была прыватызаваная, 40 кіламетраў ад Мінска, а вось дамок незарэгістраваны, бо на той час можна было рэгістраваць толькі дабудаваныя дачы. Хоць дом і не вялікі, 5 на 3 метры, і зямлі толькі 4,4 соткі, затое сваё, можна і агародзік пасадзіць, дзяцей і ўнукаў сваёй, натуральнай агароднінай частаваць, — думала Зінаіда Антонаўна, прымерваючыся да пакупкі. 1100 для яе былі немалыя грошы (дзе ёй, пенсіянерцы, назбіраць больш?), да таго ж такі надзел, але без дома, можна было купіць за 600—800 долараў. Але вельмі ўжо хацелася, каб з домам, і Зінаіда Антонаўна рашылася: набыла-такі дачу.

Калі яна прыехала ўжо ў свой дом, то была непрыемна здзіўленая тым, што былая гаспадыня выкапала буякі, клубніцы, якія раслі на ўчастку, забрала будаўнічыя матэрыялы, хоць меркавалася, што ўсё гэта ўваходзіць у кошт.

Хутка Зінаіда Антонаўна дабудавала дом, уклаўшы туды яшчэ 4-5 мільёнаў і сваю пенсію за два гады. Але потым высветлілася, што нерухомасць стаіць на месцы хлявоў, а павінна — ля дарогі, як ва ўсім садовым таварыстве. Тэхнічны пашпарт на пабудову ёсць, а ўвод у эксплуатацыю жанчына атрымаць не можа.

Цяпер, калі яна вырашыць прадаць сваю ўласнасць, будзе прадаваць проста як зямельны надзел, бо дом стаіць не на тым месцы. Праўда, пазбаўляцца ад загараднай маёмасці кабета пакуль не хоча, і тым не менш не вельмі прыемна адчуваць, што нешта з тваёй дачай не так.

А вось Ганна Віктараўна вельмі задаволеная сваёй пакупкай: пра такі дамок у вёсцы яна і марыла. Праўда, знаходзіцца ён за 150 кіламетраў ад Мінска, у Бярэзінскім раёне, але затое абышоўся новым гаспадарам усяго ў мільён бел. рублёў. Прадавалі дом знаёмыя свекрыві, а агенцтва нерухомасці праверыла ўсе дакументы, гарантавала, што ўсё ў парадку. Жанчына як даведалася пра цану, прымусіла сына і Ганну Віктараўну купіць дачу ў вёсцы. І тыя не пашкадавалі. Вялікі надзел зямлі, больш за 25 сотак, лазня, дабротны дом, гаспадарчыя пабудовы, вялікі сад з парэчкамі, малінай, агрэстам, слівай, яблыкамі ды грушамі, побач лес, рэчка — ці ж не казка гэта?! Бацькі Ганны Віктараўны і яе мужа выраслі ў вёсцы, таму такой пакупцы абрадаваліся больш за дзяцей.

— Я спакусілася на лазню, — кажа новая гаспадыня. — Дзякуй Богу, і яна, і дом у выдатным стане. Як пойдзем з мужам на пенсію, мяркуем пераехаць жыць у вёску: чыстае, маляўнічае месца, натуральная садавіна і агародніна. А зараз яшчэ гэты крызіс... Можа, давядзецца і раней уцячы на дачу ад праблем і клопатаў. Далекавата, праўда, ад Мінска, але я ніколькі не шкадую, што купілі дом у вёсцы.

Пасля пакупкі нерухомасці сям'ёй Ганны Віктараўны, амаль усе астатнія свабодныя дамкі ў гэтай вёсцы хутка раскупілі дачнікі.

**Марына ЛЯВОШКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

| Наименование объекта | Изолированное помещение (аптечный пункт первой категории) | Изолированное помещение (аптека № 131) |
|---|---|---|
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Ратайчицы, ул. С.Вирко, 84 | Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Денисковичи, ул. Мира, 1 |
| Продавец объекта | Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» тел. 80162 41 60 10, 41 69 50 | |
| Начальная цена продажи, руб. | 21 323 942 | 44 312 578 |
| Сумма задатка, руб. | 2 130 000 | 4 430 000 |
| Характеристика объекта | Здание 1958 г.п., 1-этажн., холодная пристройка, забор дощатый, площадь здания – 56,3 кв.м | Здание 1976 г.п., 2-этажное, площадь – 168,1 кв.м. |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 80162 20 87 85, 23 44 06, www. brest–region.by* | |

Аукцион состоится **25 августа 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 24.08.09 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

5. Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

6. Представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного объекта осуществляется в установленном законодательством порядке:

победителем торгов, являющимся резидентом Республики Беларусь, – в рублях;

победителем торгов, являющимся нерезидентом Республики Беларусь, – в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения аукционных торгов определяются Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 24 августа 2009 года включительно.**

Васіль РАНЬКО:

# «ГАНДЛЁВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ГОМЕЛЯ РАЗВІВАЮЦЦА ЎПОРАВЕНЬ З ЧАСАМ»



**ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ**

**Ураджэнец Гомельшчыны. Пасля заканчэння школы паступіў у Гомельскі кааператыўны інстытут (цяпер — Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі). Пасля — служба ў арміі. У гандлі працуе з 24-гадовага ўзросту. Спачатку ў Полацку, а з 1999 года — у Гомелі, дзе яму прапанавалі пасаду намесніка начальніка ўпраўлення гандлю гарвыканкама, якое ён узначаліў у 2005 годзе. Васіль Васільевіч з тыпу сучаснага кіраўніка: мэтанакіраваны, чулы, з масай новых ідэй. Гандлёвыя работнікі адзначаюць: з ім цікава працаваць.**

**— Васіль Васільевіч, чым з'яўляецца агульнагарадская гандлёвая сетка?**

— Гэта 1220 крамаў, павільёнаў, гандлёвых цэнтраў з гандлёвай плошчай 169,3 тысячы квадратных метраў, што складае 340,7 кв. м на тысячу чалавек. А таксама — 522 рэстараны, кавярні, бары, сталовыя і іншыя аб'екты. У горадзе дзейнічае 19 рынкаў на 7,7 тысячы гандлёвых месцаў. Найбольш буйнымі суб'ектамі гандлю з'яўляюцца ААТ «Алеся», «Зубр», «Дабрабыт», «Цэнтр», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гандлёвы дом «Рэчыцкі», «Тытуньвінгандаль», «Цукаргандаль», КУП «Гомельскі гарадскі камбінат школьнага харчавання», ГКАРУП «Аблгандальсаюз».

**— Мяркуючы па ўсім, у гандлі і грамадскім харчаванні горада занята цэлая, скажам так, армія народу...**

— Больш за 35 тысяч чалавек.

**— Вы можаце назваць вынікі іх работы за паўгоддзе?**

— А чаму не? Рознічны тавараварот склаў 965,1 мільярда рублёў і павялічыўся ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на 2,1 працэнта, у тым ліку тавараварот грамадскага харчавання — 79,5 мільярда. Калі гаварыць пра сярэднямесячны тавараварот агульнагарадской гандлёвай сеткі, дык сума яго — 160,85 мільярда рублёў. Назаву і такія лічбы. Прырост рознічнай гандлёвай сеткі за першае паўгоддзе склаў 72 аб'екты з гандлёвай плошчай 16,3 тысячы кв. м і прадпрыемстваў грамадскага харчавання — 42 на 141 месца.

**— Якія найбольш буйныя і сучасныя аб'екты гандлю адкрыліся ў горадзе?**

— Гандлёвыя цэнтры «Сакрэт» па вуліцы Гагарына, «Галерэя» па вуліцы Катуніна, дзе гандлёвая плошча складае адпаведна 12,8 і 2,3 тысячы квадратных метраў. Актыўна развіваецца сетка крамаў кшталту «дыскаўнтар» (па зніжаных цэнах). Так, прыватным гандлёвым унітарным прадпрыемствам «Гомельская ўніверсальная база» адкрыта крама «Вікторыя», а таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Еўрагандаль» — крамы па вуліцы Уладзімірава і Багдана Хмяльніцкага.

Сярод сучасных аб'ектаў грамадскага харчавання асаблівай увагі заслугоўвае адкрыццё забаўляльнага цэнтра «Еўропа» прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Рэстаран «Белая Русь». Ён уключае ў сябе два рэстараны на 230 месцаў, тры бары — па 140 месцаў, кавярня-марожанае «Джаконда» і г.д.

**— А што можна сказаць наконт забеспячэння крамаў таварамі?**

— Асартымент іх вельмі багаты, што адзначаюць і госці з далёкага замежжа. Пакупнікі могуць набыць усё неабходнае.

**— Якія перспектыўныя пытанні развіцця гандлю горада?**

— Укараненне прагрэсіўных формаў і метадаў продажу тавараў з аказаннем шырокага спектра паслуг. Правядзенне рамонтаў, рэканструкцыя існуючых аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Будаўніцтва новых крамаў выхаднога дня — гіпермаркетаў і супермаркетаў. Развіццё сеткі дысконтных крамаў. Правядзенне выставак-продажаў тавараў народнага спажывання, распродаж тавараў сезоннага прызначэння.

**Віншую ўсіх работнікаў гандлёвай сферы з прафесійным святам. Удачы вам у працы, добрага настрою, моцнага здароўя, фінансавага дабрабыту, шчасця!**

# ТЭРЫТОРЫЯ НІЗКІХ ЦЭНАЎ

Гутарым з дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гандлёвы дом «Гомельскі» Галінай Барбаровіч, і першае пытанне, якое задалі ёй, было: з якімі поспехамі ідзе калектыў да свайго прафесійнага свята? Адказ быў кароткі: стараемся. У гэтым месяцы, напрыклад, тавараварот на дзвесце мільёнаў рублёў перавышае паказчык чэрвеня. Нагул жа ў сярэднім за кожны месяц ён складае паўтара мільярда рублёў, што з'яўляецца нядрэнным вынікам. Нарошчванне тавараабароту, дадае Галіна Фёдараўна, адбылося ў значнай ступені пасля таго, як у гандлёвых установах укаранілі самаабслугоўванне. Пакупнік, дзякуючы гэтаму, сам знаходзіць, што яму трэба, што яго можа задаволіць: якасць тавару, цэны і г.д.

ААТ «Гандлёвы дом «Гомельскі» было створана ў 2000 годзе на базе крамы № 4 «Прадуктовыя тавары». Пасля правядзення ў 2004 годзе капітальнага рамонту і рэканструкцыі былі адкрыты крамы «Універсам», «24 гадзіны», «Трыкатаж, абутак», «Карысныя рэчы», нарыхтоўчыя цэхі па вырабе кулінарнай прадукцыі, кандытарскіх і хлебабулачных вырабаў. Усе рознічныя прадпрыемствы аснашчаны сучасным гандлёва-тэхналагічным абсталяваннем, камп'ютарна-касавымі сістэмамі разліку, плацежнымі тэрміналамі.

Каб павялічваць рознічны тавараварот, калектыў «Гомельскага» праводзіць сумесныя акцыі-распродажы па зніжаных цэнах, выстаўкі-продажы, выстаўкі-дэгустацыі, пашыраныя продажы тавараў з выкарыстаннем гнуткай сістэмы зніжак. Вось яны:

пенсіянерам у перыяд з 8 да 12 гадзін — на 5 працэнтаў;

пры разліку за харчовыя тавары трымальнікам пластыкавых картак ААТ «Белінвестбанк» — на 2,5 працэнта;

на кулінарныя і кандытарскія тавары ўласнай вытворчасці ў перыяд з 8 да 11 і з 17 да 22 гадзін — на 15 працэнтаў;

на агульную суму чэка звыш 50 тысяч рублёў — на 2 працэнты.



Добры настрой у дырэктара ААТ «Гандлёвы дом «Гомельскі» Галіны БАРБАРОВІЧ і намесніка дырэктара Аляксандра ВІВАЛЬНЮКА.



Універсам «Гомельскі».

Вядома ж, праводзіцца і водпуск тавараў у крэдыт і растэрміноўку, і хто-ніхто з пакупнікоў карыстаецца гэтай паслугай. Галіна Фёдараўна звярнула ўвагу на тое, што зніжкі дзейнічаюць на 60 працэнтаў тавараў, і кошт іх меншы на 8—10—15 працэнтаў. А дасягаецца гэта дзякуючы паразуменню з пастаўшчыкамі (мяса-малочнымі прадпрыемствамі — вытворцамі, у асноўным), якія таксама робяць зніжку сваёй прадукцыі. У выніку цэны на асобныя тавары ў акцыянерным таварыстве (мяса птушкі, кансервы гароднінныя і г.д.) таннейшыя, чым у многіх гандлёвых арганізацыях краіны.

У крамах ААТ заўсёды ў шырокім асартыменце ўсе тавары, вялікі выбар іх, як харчовых, так і прамысловых. Адкрыта летняя кавярня, латок па продажы свежых фруктаў і гародніны, тавараў школьнага асартыменту. Дзейнічае вялікая крама «Тавары для дому», пачаўся рамонт рэстарана «Пунсовая кветачка».

У гандлёвым доме «Гомельскі» 188 работнікаў. Шмат хто з іх назаўсёды звязаў свой лёс з гандлем. Сама Галіна Фёдараўна працуе ў ім з 1971 года. Як кажуць, стрыжнем прадпрыемства з'яўляюцца намеснік дырэктара таварыства Аляксандр Вівальнюк, галоўны бухгалтар Таццяна Галаева, начальнік планавага аддзела Валянціна Капітанава і гандлёвага — Таццяна Грачышкіна, таваразнаўцы Тамара Салай, Людміла Любезная, Вольга Аўчарэнка, загадчык вытворчасці Ірына Бераснёва, электрык Віктар Заяц, кандытар Людміла Цітова, кухар Лілія Сакалова. Толькі пахвальных слоў заслугоўваюць загадчыца крамы «Універсам» Таісія Сядая і яе намеснік Паліна Шышына, прадавачкі Алена Курліна, Людміла Самышына, Паліна Волкава, загадчык крамы «24 гадзіны» Вадзім Берчанка. На іх раўняецца ўвесь калектыў.

УНН 400093001

# І «БРОНЗАВЫ МЕРКУРЫЙ» — ТАКСАМА



Што дзень наступны нам рыхтуе? Дырэктар камунальнага аптова-рознічнага ўнітарнага прадпрыемства «Дыялог-Гомель» Ганна БУРАНКОВА.

У жніўні мінулага года камунальнае аптова-рознічнае ўнітарнае прадпрыемства «Дыялог-Гомель» адзначыла свой 15-гадовы юбілей. Гэта вельмі важная для калектыву дата. Бо адбылося яго станаўленне, дасягнуты былі вынікі, якія ацэнены на самым высокім узроўні. Назавём іх.

За лепшую арганізацыю гандлёвага абслугоўвання насельніцтва, забеспячэнне высокага ўзроўню культуры гандлю, эфектыўную гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога і Гомельскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, адміністрацый раёнаў горада, падзякамі ад прадпрыемстваў-вытворцаў краіны і пакупнікоў.

Так, за перыяд з 2001 па 2007 год «Дыялог-Гомель» з'яўляўся лепшым у сферы гандлю і бытавога абслугоўвання горада. У 2006 годзе прадпрыемства ўдастоена ганаровай узнагароды міністэрства «Бронзавы Меркурый» па выніках працы за папярэдні год у намінацыі «За лепшую арганізацыю гандлёвага абслугоўвання насельніцтва, забеспячэнне высокага ўзроўню культуры гандлю, высокаэфектыўную гаспадарчую дзейнасць у сферы арганізацыі рознічнага гандлю нехарчовымі таварамі».

А праз год дырэктар прадпрыемства Ганна Аляксандраўна Буранкова атрымала такую ж самую ўзнагароду («Бронзавы Меркурый») у намінацыі «За высокія прафесійныя дасягненні ў сферы гандлёвай дзейнасці». Тады ж прадпрыемства было занесена на рэспубліканскую Дошку гонару па выніках 2006 года. У 2008 годзе — яшчэ адна працоўная перамога і занясенне на абласную Дошку гонару.

— Як вашаму калектыву ўдаецца браць такія вышыні? — пытаем у Ганны Аляксандраўны.

— Працуем, — сціпла адказвае яна. — У нас шырокі асартымент тавару, сярэдні ўзровень цэнаў, высокая якасць абслугоўвання, безумоўныя гарантыі кліентам, зручны час працы, зніжэнне надбавак, сучаснае тэхналагічнае і гандлёвае абсталяванне, дызайн і рэклама, выставы-продажы і хуткае рэагаванне на змены пакупнога попыту. Гэтыя асноўныя перавагі і дазваляюць нам захаваць і падтрымліваць канкурэнтаздольнасць прадпрыемства на рынку тавараў і паслуг.

Пра многае цікавае і павучальнае расказвае Ганна Аляксандраўна. «Дыялог-Гомель» актыўна падтрымлівае айчыннага таваравытворцу, сведчаннем чаго з'яўляецца продаж 75 працэнтаў беларускіх тавараў у агульным іх аб'ёме. Прадпрыемства з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком беларускіх трыкатажных брэндаў: ААТ «Купалінка», «Брэсцкі панчошны камбінат», «КІМ». Дзейнічае гнуткая сістэма работы з кліентамі: рэалізацыя тавару без аптовай нацэнкі, цэнтралізаваная дастаўка, адтэрміноўка плацяжу.

На прадпрыемстве ўкаранёны новы праграмна-апаратны комплекс і адпаведнае праграмнае забеспячэнне для вядзення дыферэнцыяванага ўліку звестак аб таварах, якія маюцца ў гандлёвых залах крамаў, запасаў на складах, аб'ёмаў продажу, тэрмінах захоўвання і г.д.

Адным словам, калектыў «Дыялог-Гомеля» працуе паспяхова. За паўгода выкананы ўсе даведзеныя паказчыкі. Рост рознічнага тавараабароту склаў 128,2, аптовага — 125,3, заработнай платы — 109,6 працэнта. Узровень рэнтабельнасці склаў 1,93 працэнта.

Работнікі прадпрыемства ўмеюць не толькі добра працаваць, але і добра адпачываць. Зімой арганізуюцца паходы на лыжах, катанні на санках і каньках, вясной і летам — розныя фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы. У тым ліку экскурсійныя туры па гарадах Беларусі: Нясвіж — Мірскі замак — Жыровічы — Мінск, паездка ў Кіеў. І гэта былі не толькі экскурсіі, не проста адпачынак, а знаёмства з культурай і гісторыяй сваёй краіны і суседзяў, запазычанне новых прагрэсіўных метадаў работы.

УНН 400092988



У адной з крамаў КАРУП «Дыялог-Гомель».

# «АЛЕСЯ» ІДЗЕ НАПЕРАД

Адкрытае акцыянернае таварыства «Навабеліцкая гандлёвая кампанія «Алеся» першай сярод гандлёвых прадпрыемстваў Гомеля рэфармавалася з Навабеліцкага райхарчгандлю ў 1995 годзе. Сёння ААТ — адно з найбуйнейшых у вобласці аптова-рознічных прадпрыемстваў. «Алеся» — узор камерцыйнага бізнэсу Гомельшчыны, і яго калектыў з'яўляецца лаўрэатам Ганаровай узнагароды Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь «Бронзавы Меркурый». Больш як 15 гадоў калектыў узначальвае дэпутат Гомельскага абласнога і гарадскога Саветаў Уладзімір Барысавіч Іофін, заслужаны работнік сферы паслуг Рэспублікі Беларусь.



Адзін з ветэранаў гандлю вобласці, генеральны дырэктар ААТ «Навабеліцкая гандлёвая кампанія», дэпутат Гомельскага абласнога і Гомельскага гарадскога Саветаў Уладзімір ІОФІН.

У акцыянернае таварыства ўваходзіць 17 крамаў, найбольш буйныя з якіх — супермаркет «Чарнігаўскі», універсам № 23 у 35-м мікраараёне, крама № 4 «Алеся» ў цэнтральнай частцы Навабеліцы па вуліцы Ільіча, 30, крама № 17 «Іпуць» у Залінейным раёне, два кандытарскія цэхі з крамамі «Лавашня», «Лакомка», рэстаран «Хрустальны» на 120 пасадачных месцаў і такія дапаможныя падраздзяленні, як будаўнічая група, аўтамабільны ўчастак, аптовая база.

Калектыў «Алесі» паспяхова выконвае асноўную сацыяльна важную задачу — забеспячэнне жыхароў Навабеліцкага раёна Гомеля неабходнымі таварамі і паслугамі. Таварыства працуе рэнтабельна. Расце прадукцыйнасць працы і зарплата супрацоўнікаў. За кошт прыбытку ААТ вядзе перспектыўную рэканструкцыю і будаўніцтва крамаў. У калектыве больш як 600 чалавек, каля 80 працэнтаў з іх — жанчыны. Усе работнікі маюць спецыяльную падрыхтоўку, найбольш перспектыўныя з якіх навучаюцца ў ВНУ.

Летась валавы тавараварот склаў 49 960 мільёнаў рублёў, у тым ліку рознічны — 41 062 мільёны. Прырост тавараабароту ў супастаўных цэнах — 109,9 працэнта. Атрыманы прыбытак пры ўстойлівай рэнтабельнасці работы. З улікам усіх цяжкасцяў на спажывецкім рынку, зніжэнні пакупной здольнасці насельніцтва і высокай канкурэнцыі прыгранічнага гандлю за паўгоддзе прырост тавараабароту склаў 101,1 працэнта.

На працягу апошніх трох гадоў вялікія сродкі ўкладзены ва ўдасканальванне матэрыяльнай базы. На рэканструкцыю, мадэрнізацыю і набыццё абсталявання зрасходавана каля чатырох мільярдаў рублёў. Асноўная частка крамаў адрамантавана, заменена гандлёва-тэхналагічнае і халадзільнае абсталяванне на больш эканамічнае, з высокім дызайнам, камп'ютарызацыяй, выканана добраўпарадкаванне прылеглых тэрыторый.

Сваімі сіламі і за ўласныя сродкі цалкам перабудаваны з павелічэннем гандлёвай плошчы магазіны № 9 «Вясёлка», № 14 «Паўднёвы», № 16 «Лясны». Пераведзена на самаабслугоўванне (таксама з заменай названага абсталявання) крамы № 4 «Алеся», № 17 «Іпуць», № 23 «Універсам». Магазін № 10 «Чарнігаўскі» за кошт мадэрнізацыі, пашырэння і паслуг грамадзянам атрымаў статус «Супермаркета». Маштабныя работы выкананы па рэстаране «Хрустальны»: у сучасным стылі пераўтворана ўваходная група, зроблены касметычны рамонт асноўнай залы, кандытарскага цэха. Асаблівы гонар — банкетная зала. Усё выканана з вышэйшым дызайнам. Пералік падобнага можна працягваць і далей.

Рэнтабельная работа — гэта заўсёды вялікая колькасць якаснага і патрэбнага людзям тавару. Не сакрэт, што 2009 год для сферы гандлю пачаўся ў складаных эканамічных умовах. Калі ў мінулыя гады рост тавараабароту ў супастаўных цэнах забяспечваўся стабільна, то сёлета склалася няпростая сітуацыя. Да яе ў ААТ паставіліся без панікі. Былі распрацаваны мерапрыемствы па пераадоленні крызісу. Паспрыяла яшчэ гэтаму і тое, што летась з дапамогай упраўлення гандлю работнікі ААТ наведалі лепшыя гандлёвыя прадпрыемствы Мінска, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей, а таксама вывучылі вопыт работы гандлю ў Чарнігаве.

Калектыў старанна збірае ўсё новае ў частцы размяшчэння гандлёвага абсталявання, выкладкі, умення прыцягнуць пакупніка. Не засталося для яго непрыкметным і адкрыццё дыскаўнтара «Еўропа». Каб паспяхова канкурыраваць з сеткавымі крамамі і дыскаўнтарамі, тут перабудавалі работу з пастаўшчыкамі, заключылі пагадненні па ўзаемных зніжэннях адпускных цэнаў і гандлёвых надбавак. У крамах функцыянуюць дысконтныя аддзелы, дзе пакупнікам прапанаваны больш танныя тавары. Не зняты з парадку дня і ўдзел ва ўсіх сезонных і святочных кірмашах.

З прыходам лета адкрыты 4 міні-кавярні, і там пакупніку прапануюцца прахаладжальныя напоі і квас, кандытарскія і кулінарныя вырабы. Шырока практыкуецца і выносны гандаль каля крамаў. Працягнуты гадзіны работы крамаў, што, безумоўна, садзейнічае павелічэнню тавараабароту.

У ліпені ў пяці крамах увялі ў дзеянне дысконтныя карткі з накапляльнай сістэмай зніжак. Так, у ранішнія і вячэрнія гадзіны ў аддзелах кулінарыі на прадукцыю і на працягу ўсяго працоўнага дня дзейнічаюць зніжкі на ўвесь асартымент, выключаючы тавары па фіксаваных цэнах. Ва ўсіх крамах устаноўлены кандыцыянеры, і пакупнікі спякотным летам адчуваюць у іх сябе камфортна. Вялікая ўвага надаецца безнаяўным разлікам з прымяненнем пластыкавых картак, удзельная вага якіх пастаянна расце.

Прыярытэт у гандлі «Алеся» аддае айчынным вытворцам. У кожнай буйной краме ўстаноўлены акварыумы для жывой рыбы. Прапанавана шырокая гама плодаагароднінnай прадукцыі і сокаў. Распрацоўваюцца і паступаюць у гандлёвую сетку навінкі кулінарнай прадукцыі і кандытарскіх вырабаў. Выпечка, тарты, дэсерты, піражныя карыстаюцца вялікім попытам у пакупнікоў з-за высокай якасці, дызайну і параўнальна нізкіх цэнаў. У перадсвяточныя і святочныя дні арганізуюцца выстаўкі-продажы гэтых вырабаў, якія рыхтуюць майстры сваёй справы. Яны шматразова бралі ўдзел і займалі прэстыжныя месцы ў розных конкурсах. Напрыклад, на міжнародным фестывалі «славянская кухня» ў Чарнігаве — першае месца і Кубак Дружбы, трэцяе месца ў рэспубліканскім конкурсе кухарскага мастацтва ў Мінску.

Вялікая ўвага ў акцыянерным таварыстве надаецца пытанням патрыятычнага і маральнага выхавання, умацавання працоўнай дысцыпліны, стварэння бяспечных умоў працы, паляпшэння быту, падтрымання здаровага ладу жыцця работнікаў. У калектыве створаны нармальны маральна-псіхалагічны клімат. Дзейнічае сістэма навучання, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Значную дапамогу ў рабоце адміністрацыі аказваюць грамадскія фарміраванні: прафсаюзная, ветэранская і моладзевая арганізацыі, пярвічнае аддзяленне аб'яднання «Белая Русь». Адным з першых у буйных універсамах створаны ячэйкі абласнога аддзялення БРСМ — камсамольска-моладзевыя брыгады. За кожным пажылым работнікам замацаваны адказныя — так дзейнічае Савет ветэранаў. Ніводнае свята (Дзень абаронцаў Айчыны або Дзень жанчын і г.д.) не застаецца без урачыстых мерапрыемстваў — і ў гэтым бачна дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі. Калектыў «Алесі» прызнаны лепшым у Гомелі і вобласці па арганізацыі ідэалагічнай работы.

Работнікі акцыянернага таварыства з аптымізмам глядзяць у будучыню. У яго планах — працяг па ўдасканальванні гандлёвай сеткі, напаўненне крамаў шырокім асартыментам тавараў, пошук новых формаў і метадаў арганізацыі гандлю. Сваё прафесійнае свята яны сустракаюць дастойна. «Алеся» ідзе наперад.

УНН 400030267

# ДЫПЛОМ ЗА ДЫПЛОМАМ



Гандлёвы дом «Рэчыцкі».

Калі падыходзіш ці пад'язджаеш да групы крамаў адкрытага акцыянернага таварыства «Гандлёвы дом «Рэчыцкі», то міжволі звяртаеш увагу на будынак рэстарана, на якім вялікімі літарамі напісана «У нас абеды таннейшыя». Няўжо праўда, спыталі мы ў генеральнага дырэктара ААТ Ніны Наркевіч.

— А то як жа, — адказала яна. — Таннейшыя, чым у іншых арганізацыях, у тым ліку і ў вышэйшых навучальных установах. Таму і ідзе да нас народ. Уявіце сабе, што раней днём пасадачная зала рэстарана ў абедзенны час часцей за ўсё пуставала. Сёння яна запоўнена. Больш за тое, задзейнічана і банкетная зала. Адсюль і дадатковыя грашовыя паступленні.

— І ўсё ж, Ніна Андрэеўна, за кошт чаго?

— За кошт абарачальнасці. Прааналізаваўшы стан спраў, мы прыйшлі да высновы, што калі знізіць гандлёвыя нацэнкі, то людзі да нас пойдуць ахвотна. З гэтай мэтай правялі вялікую работу. На пад'ездах дамоў, у ВНУ, на прадпрыемствах з'явіліся нашы лістоўкі аб новаўвядзенні. Вось і ўсё. Рэклама зрабіла сваё. Новай формай работы апошнім часам стала і адкрыццё шасці летніх кавярняў. І тут разлік — павелічэнне тавараабароту. За сезон дадаткова можа быць прададзена тавару ў іх на мільярд рублёў. Чым не падмога?



Чырвоны дыплом за паспяховую работу ў руках генеральнага дырэктара ААТ «Гандлёвы дом «Рэчыцкі» Ніны НАРКЕВІЧ.

Ніна Андрэеўна працуе ў гандлі з 1979 года, а генеральным дырэктарам найбуйнейшага ў Гомелі адкрытага акцыянернага таварыства «Гандлёвы дом «Рэчыцкі» з'яўляецца ўжо 12 гадоў. Вопытны кіраўнік, паважаны чалавек у горадзе, дэпутат гарадскога Савета, яна многае зрабіла і робіць для таго, каб прадпрыемства было на належнай вышыні, дэманстравала перадавыя метады абслугоўвання пакупнікоў, дабівалася добрых эканамічных паказчыкаў.

Дзе толькі ні бывалі спецыялісты таварыства, каб вывучыць перадавы вопыт ды ўкараніць яго ў сябе. Адсюль — паездкі ў Мінск, Віцебск, Гродна, Чарнігаў, Кіеў, Смаленск. Там прыглядваліся і да работы гіпермаркетаў, арганізацыі продажу прамысловых тавараў, гародніны і садавіны, гаспадарчай групы тавараў, каб карыснае прымяніць у сябе. Дапытлівасць, старанне, творчае стаўленне да работы далі свой вынік: калектыў «Рэчыцкага» ўжо сам дзеліцца каштоўным вопытам.

Акцыянернае таварыства ўключае ў сябе 12 крамаў, бар, рэстаран, кандытарскі цэх. Персанал — 500 чалавек. Прадпрыемства працуе рэнтабельна, бесперапынна мадэрнізуецца і адкрывае новыя крамы. На працягу дзевяці гадоў ААТ з'яўляецца пераможцам гарадскога спаборніцтва сярод прадпрыемстваў гандлю і ўзнагароджаны Ганаровымі знакамі выканаўчага камітэта. Рашэннем калегіі Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь калектыву гандлёвага дома «Рэчыцкі» прысуджана ганаровая ўзнагарода «Бронзавы Меркурый» у намінацыі «За высокія прафесійныя дасягненні ў сферы гандлёвай дзейнасці».

Вядома ж, галоўнай каштоўнасцю арганізацыі з'яўляюцца яе работнікі. Высокае пачуццё адказнасці за даручаную справу ўласцівае кожнаму з іх ад прадаўца да дырэктара крамы. Усе яны працуюць пад адным дэвізам: «Усё для задавальнення спажывецкага попыту насельніцтва».

Расказ аб калектыве будзе няпоўным, калі не нагадаць, што тут пастаянна вядзецца ідэалагічная, культурна-масавая і спартыўная работа, арганізоўваюцца конкурсы прафмайстэрства сярод прадаўцоў, афіцыянтаў, кухараў, што развіваецца настаўніцтва, вялікая ўвага надаецца рабоце з ветэранамі і шматдзетнымі маці.

Адзін з прыярытэтаў выхаваўчай работы — развіццё фізкультуры і спорту, культурна-масавай работы. Створаны ансамбль «Гармонія», харэаграфічны і тэатральны калектывы «Вясёлка» і «Павер у сябе». Калектывамі мастацкай самадзейнасці арганізоўваюцца канцэрты на ўрачыстых сходах да святочных датаў, выступленні перад насельніцтвам. Вынікам такой работы сталі шматлікія граматы і дыпломы, заваяваныя на конкурсах самадзейнай народнай творчасці.

Калектыў ААТ «Гандлёвы дом «Рэчыцкі» дастойна сустракае сваё прафесійнае свята. За першае паўгоддзе ён дабіўся рэнтабельнасці ў 2,56 працэнта.

УНН 400054000

**ПАВАЖАНЫЯ ПРАЦАЎНІКІ ГАНДЛЮ!**

**АД УСЯГО СЭРЦА ВІНШУЕМ ВАС З ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ. МОЦНАГА ЗДАРОЎЯ ВАМ, НОВЫХ ГАРЫЗОНТАЎ У ПРАЦЫ, АПТЫМІЗМУ, ФІНАНСАВАГА ДАБРАБЫТУ, СЯМЕЙНАГА ШЧАСЦЯ І ЎДЗЯЧНЫХ УСМЕШАК ПАКУПНІКОЎ.**

**Матэрыялы старонкі падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ. Фота Вячаслава СУХАДОЛЬСКАГА.**

# ВОЧКІ ПАТРАБУЮЦЬ РАЗГРУЗКІ

Прамая лінія

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 23, 24 ліпеня.)*

**На вашы пытанні адказала галоўны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вікторыя КРАСІЛЬНІКАВА.**

☎ ***— Мінск, Ліля. Ці карысныя для вачэй БАДы? І яшчэ. Дзіцяці 2 гады. Якой павінна быць прафілактыка зроку ў дзяцей, калі ў бацькоў ёсць паталогія — блізарукасць?***

— Адносна БАДаў мая думка вельмі стрыманая. Напрыклад, летам усе дабаўкі можна атрымаць у выглядзе натуральных прадуктаў. Ужываць тыя ж чарніцы, яблыкі, увогуле садавіну і агародніну. Гэта больш карысна, чым з дабаўленнем нейкіх хімічных рэчываў. Я адзначыла б, што нядрэнныя прэпараты «Чарніцы-мікст», «Чарніцы-фортэ», у якіх у канцэнтраваным выглядзе ўтрымліваецца экстракт ягады. Іх могуць прымаць і дзеці, і дарослыя. Але дзіцяці ў два гады лепш даваць чарніцы ў натуральным выглядзе. Адзінае, што трэба памятаць: вітаміны з раслін, напрыклад, з той жа морквы, засвойваюцца толькі пры дабаўленні тлушчаў — смятаны ці алею, паколькі з'яўляюцца тлушчараставаральнымі. Што датычыцца прафілактыкі блізарукасці... Так, яна мае тэндэнцыю перадавацца ў спадчыну, але не перадаецца яе ступень. Таму прафілактыку добрага зроку ў дзіцяці трэба пачынаць ужо цяпер. Калі ў дзіцяці ёсць схільнасць да міяпіі, то не давайце яму вельмі дробныя цацкі. Яны павінны быць вялікімі і яркімі, каб іх можна было разглядаць на дастатковай адлегласці ад вока. Бо калі вы дасце дробныя прадметы, якія неабходна разглядаць блізка, дзіця будзе ўвесь час уключаць у працэс разглядання гэтага прадмета акамадацыйную мышцу вока, якая не прыстасаваная ў маленькіх дзяцей для работы на блізкай адлегласці. Яшчэ: кніжкі маломуy таксама трэба даваць з вялікімі, выразнымі літарамі, а не з дробным шрыфтам. Калі вы пераходзіце да чытання, дзіця трэба навучыць правілам гігіены зроку. Яно павінна ведаць, што нельга чытаць лежачы на падлозе. Чытаць трэба седзячы. Акрамя таго, трэба змяняць зрокавыя нагрузкі. Напрыклад, на працягу 5—10 хвілін вы разглядаеце кніжку, потым — адпачынак, змена дзейнасці на актыўную гульню. І, безумоўна, ні ў якім разе не прывучайце дзіця з 2 гадоў да камп'ютарных гульняў.

З узростам колькасць усялякіх дадатковых абмежаванняў будзе крыху павялічвацца. Але калі вы адразу навучыце дзіця здароваму ладу жыцця, у далейшым гэта дапаможа пазбегнуць многіх праблем з вачыма.

☎ ***— Гомель, Антаніна Пятроўна. Маёй дачцэ 5 гадоў. Калі яна прыходзіць з вуліцы, у яе слязяцца і свярбяць вочы. З чым гэта можа быць звязана?***

— Хутчэй за ўсё, у дзіцяці вясенне-летні катар. Гэта алергічная рэакцыя, звязаная з цвіценнем траў, дрэў, раслін. Для выяўлення алергена неабходна звярнуцца да алерголага, каб ён паставіў алергічныя пробы і выявіў непасрэдна той алерген, які выклікае такую рэакцыю. А каб прызначыць лячэнне, трэба звярнуцца да акуліста па месцы жыхарства. Спецыяліст прызначыць прэпараты, якія пагашаюць гэтую рэакцыю. Для прафілактыкі такога стану звычайна за два тыдні да пачатку меркаванага цвіцення траў прызначаюцца антыгістамінныя прэпараты, якія дазваляюць поўнасцю ліквідаваць непрыемныя адчуванні, і ваша дзіця будзе здаровае.

☎ ***— Салігорск, Таццяна Фёдараўна. У маёй 15-гадовай дачкі вельмі дрэнны зрок, вялікая блізарукасць, прыроджаная міяпія правага вока. Вучыцца з такім зрокам цяжка. Як нам лячыцца?***

— Перш за ўсё ваша дзіця павінна быць абследавана ў акуліста і не толькі па месцы жыхарства, але і абавязкова ў афтальмолага ў Рэспубліканскім кансультацыйным цэнтры. Гэта можна зрабіць у 4-й гарадской клінічнай бальніцы, дзе будуць выкананы больш тонкія даследаванні, якія немагчыма зрабіць ва ўмовах паліклінікі. Таксама можна звярнуцца ў Мінскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу, якая таксама валодае ўсімі сучаснымі метадамі дыягностыкі захворванняў вока. Для палягчэння вучобы неабходна, калі ёсць паказанні, аформіць групу інваліднасці. І вучыцца ў спецыялізаванай школе для дзяцей з аслабленым зрокам. Палохацца такіх школ не трэба. У шэрагу выпадкаў дзеці атрымліваюць тут нават лепшую адукацыю, чым у агульнаадукацыйных школах. Бо з імі па спецыяльных методыках займаюцца індывідуальна, класы невялікія і ўвагі вучням надаецца больш. Абавязкова трэба назірацца ў афтальмолага па месцы жыхарства, сачыць за захаваннем гігіены зроку. А ў далейшым неабходна правільна выбраць прафесію, якая была б больш звязана са слыхам, чым са зрокавай работай. Напрыклад, такія дзеці добра вучацца і бываюць вельмі запатрабаваныя, калі ідуць у медыцынскія каледжы, дзе набываюць спецыяльнасць мануальнага тэрапеўта. Сёння ў навучальных установах ёсць групы для дзяцей з аслабленым зрокам.

☎ ***— Мінск, Вера Леанідаўна. Зараз вельмі папулярныя кантактныя лінзы. Ці не шкодныя яны? Ці ёсць супрацьпаказанні для іх? І якія асаблівасці нашэння кантактных лінзаў?***

— Баяцца кантактных лінзаў не варта, калі вы ўпэўнены, што ваша дзіця захоўвае ўсе гігіенічныя меры перасцярогі пры выкарыстанні кантактных лінзаў: мые рукі перад тым, як надзець ці зняць кантактныя лінзы, захоўвае іх у спецыяльных кантэйнерах, выкарыстоўвае добрыя прэпараты для ачысткі лінзаў. Асноўнае супрацьпаказанне для нашэння кантактных лінзаў — абмежаванне нашэння пры вірусных захворваннях ці іншых хваробах, калі аслаблены імунітэт. Калі вам зроблена проба манту, то да заканчэння тэрміну яе дзеяння таксама нельга насіць лінзы. Такія абмежаванні патрэбны прыкладна на працягу тыдня. Акрамя таго, трэба ведаць, што кантактныя лінзы поўнасцю не заменяць акуляры. Апошнія, як варыянт запаснай карэкцыі, павінны заўсёды быць пад рукой.

☎ ***— Гродна, Ніна. У майго 13-гадовага сына рэзка ўпаў зрок. Зараз ён 0,3—0,6. Афтальмолаг выпісаў акуляры, але яны не дапамагаюць, становіцца горш. Што рабіць?***

— Перш за ўсё такое дзіця павінна быць грунтоўна абследавана ў акуліста па месцы жыхарства. Гэтае абследаванне павінна ўключаць у сябе як праверку вастрыні зроку, так і праверку рэфракцыі або праламляльнай здольнасці вока (цыклаплэгіі) ва ўмовах пашыранай зрэнкі. Калі зрок знізіўся да 0,3—0,6 нядаўна, то гэта можа быць стан, які называецца спазм акамадацыі. Пры гэтым працэс можа мець абарачальны характар і пры пэўных умовах зрок можна яшчэ аднавіць. Трэба стварыць спрыяльныя ўмовы для работы на блізкай адлегласці, абмежаваць работу з камп'ютарам, павялічыць фізічныя нагрузкі, больш рухацца, вельмі добра дапамагае плаванне. Што датычыцца акуляраў. Усё залежыць ад таго, як яны падабраныя. Калі маецца спазм акамадацыі, сапраўды акуляры могуць толькі пагаршаць стан. Падбор акуляраў павінен праводзіцца толькі пасля цыклаплэгіі.

☎ ***— Капыльскі раён, Мікалай Іванавіч. Скажыце, доктар, якія прадукты садзейнічаюць умацаванню зроку?***

— Гэта прадукты, якія ўтрымліваюць вітаміны А, С, Е — так званы антыаксідантны комплекс, вітаміны групы В. Вельмі карысныя чарніцы, іх можна ўжываць у дастаткова вялікай колькасці, потым морква, якая ўтрымлівае вітамін А, але ён засвойваецца толькі ў тлушчах з алеем, маслам, смятанай, маянэзам. Рэкамендуюцца прадукты з вітамінам В, якія карысны для сятчаткі і рагавіцы. Вітаміны групы В ёсць у мясных прадуктах, пячонцы, злакавых. У дзяцей павінен быць больш шырокі рацыён. Ніякіх дыет і аднастайнай ежы. Больш тварагу, кісла-малочных прадуктаў, у якіх шмат кальцыю, ёсць калій. Менш вяндліны, саленняў, макароны, кашаў.

☎ ***— Мінск, Ганна Васільеўна. Хачу папытацца наконт сваіх дзяцей. У 11-гадовага сына міяпія высокай ступені з астыгматызмам. Ці можна яму насіць лінзы? У 10-гадовага сына была дальназоркасць. Цяпер прайшла, зрок у яго ўдалячынь — адзінка. Але адно вока пачало касіць, што можна з гэтым зрабіць?***

— Кантактныя лінзы з высокай ступенню астыгматызму насіць можна. Дзіцяці нават будзе больш прыемна і зручна, бо ў яго не абмяжоўваецца поле зроку, і прадметы ён убачыць у нармальную велічыню. Калі хлопчык будзе захоўваць гігіенічныя правілы нашэння лінзаў і іх догляду, то ўсё будзе добра. Але пры гэтым вы не павінны забываць, што на ўсялякі выпадак у яго абавязкова павінны быць акуляры. Напрыклад, калі ён прастудзіўся ці знаходзіцца там, дзе нельга памыць рукі... Што да другога хлопчыка, то тут у вас праблема ў наступным. Вы павінны ведаць, якая ў яго была дальназоркасць і ці не засталася яна, нягледзячы на тое, што ён бачыць на адзінку ўдалячынь. У дзяцей можа быць так званая схаваная дальназоркасць, пры якой яны бачаць удалячынь на адзінку, але пры рабоце на блізкай адлегласці вачам не камфортна. Вочы пачынаюць стамляцца і тады, каб адно вока адпачыла, другое проста пачынае адыходзіць убок. Цяпер, на канікулах, вы абавязкова павінны правесці поўнае абследаванне сына. Праверыць яго рэфракцыю на цыклаплегіі. Калі абследаванне пакажа, што застаецца невялікая дальназоркасць, то яму абавязкова патрэбны акуляры для чытання, інакш вока будзе адхіляцца. Акуляры для чытання створаць спрыяльныя ўмовы для работы на блізкай адлегласці, і вока стане роўна.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**
*(Працяг будзе.)*

# ЖЫВОТ БАЛІЦЬ...

Лечымся без лекаў

**Гастрыты, язвы, каліты, набываючы хранічны характар, істотна зніжаюць якасць жыцця, робяць чалавека залежным ад лекаў. Справіцца з некаторымі праблемамі можна з дапамогай народнай медыцыны.**

● Для паляпшэння апетыту, зняцця спазмаў і боляў прыгатуйце наступны настой: 2 ст. лыжкі насення кропу заліце ў тэрмасе 0,5 л кіпеню, настойвайце 30—40 хвілін, працадзіце, піце па паўшклянкі за паўгадзіны да яды 3 разы на дзень.

● Пры гастрыце з павышанай кіслотнасцю дапамагае мёд (1 ст. лыжка), разведзены ў шклянцы вады. Раствор трэба прымаць за дзве гадзіны да яды 2—3 разы на дзень на працягу двух месяцаў.

● Пры гастрыце з паніжанай кіслотнасцю паспрабуйце піць сок чорных парэчак па 50 мл перад ядой 3 разы на дзень на працягу месяца.

● Пры язве страўніка прымайце адвар бульбы без солі па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень. На кожны прыём гатуйце свежы адвар.

● Пры язве дванаццаціперснай кішкі эфектыўная наступная сумесь: бялок свежага яйка ўзбіце з 1 ч. лыжкай цукровай пудры і 1 ст. лыжкай аліўкавага алею; прымайце сумесь нашча па 1 ст. лыжцы на працягу дзесяці дзён.



● Пры паносе: зерне ячменю (50 г) заліце 0,5 л гатаванай вады, праварыце 10 хвілін, настойвайце 4—6 гадзін. Працадзіце. Прымайце па 1/4 шклянкі 3—4 разы на дзень. А таксама пры расстройстве жывата дапамагаюць адвар з сушаных груш ці рысавы адвар.

● Для паляпшэння дзейнасці кішэчніка штодзень з'ядайце нашча па 100—150 г буракоў.

● Ад запораў дапамагае мякаць гарбуза, змешаная з мёдам. А яшчэ паспрабуйце на ноч прымаць настой насення лёну: 1 ч. лыжкі сыравіны заварыце 1 шклянкай кіпеню, настойвайце, ухутаўшы, на працягу 4—5 гадзін. Настой піць, не працэджваючы.

● Сок чырвонай рабіны з мёдам (сталовая лыжка на шклянку) палягчае стан пры гемароі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# ФОНД ВЫДЗЕЛІЎ ГРАНТ

**Беларусь атрымала грант Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Яго агульная сума на 2010—2014 гг. складае 23,8 млн еўра. Гэтыя сродкі пойдуць на падтрымку нацыянальных намаганняў у барацьбе з распаўсюджваннем ВІЧ-інфекцыі. Мяркуецца, што толькі за першыя два гады рэалізацыі гранта будзе патрачана каля 4 млн еўра на набыццё медыкаментаў і медыцынскага абсталявання.**

Як адзначыла намеснік міністра аховы здароўя, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Валянціна Качан, у нашай краіне ўсімі зацікаўленымі спецыялістамі была зроблена вялікая работа, каб атрымаць гэты грант.

Дадзенае пагадненне ў рэспубліцы з'яўляецца ўжо трэцім, пачынаючы з 2004 года. За гэты час фондам было выдзелена каля 65 млн долараў.

З 2004 г. працэнт ВІЧ-інфіцыраваных дзяцей, народжаных ад ВІЧ-інфіцыяваных маці, знізіўся з 12 да 3,4. Распаўсюджанасць ВІЧ-інфекцыі сярод маладых людзей ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў знізілася з 28 да 12,4 працэнта. Колькасць людзей, якія інфіцыруюцца ВІЧ штогод, захоўваецца на стабільным узроўні. Адным з важных вынікаў праграмы з'яўляецца тое, што 1300 ВІЧ-інфіцыраваных людзей працягваюць жыць, інакш кажучы, захавалі свае жыцці дзякуючы таму, што пачалі атрымліваць антырэтравірусную тэрапію ў рамках гранта.

Якія ж вынікі чакаюцца ад новага гранта? Паводле слоў **супрацоўніка прадстаўніцтва ААН у Беларусі спадара Антоніуса БРУКА,** прафілактычнай кампаніяй будзе ахоплена каля 34 тысяч людзей, якія ўжываюць наркотыкі, каля 24 тысяч мужчын, якія маюць сэксуальныя адносіны з мужчынамі, каля 8,5 тысячы жанчын, што аказваюць сэксуальныя паслугі за грошы, а таксама практычна ўсе тыя людзі, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі — гэта каля 50 тысяч чалавек. З пачатку дзеяння гранта і да яго заканчэння ад 2 да 4 тысяч чалавек будуць атрымліваць антырэтравіруснае лячэнне.

Плануюцца новыя метады работы. Напрыклад, прыцягнуць хрысціянскія цэрквы ў работу па прафілактыцы і доглядзе ВІЧ-інфіцыраваных людзей. Мяркуецца таксама ўкараніць так званы механізм сацыяльнага заказу, калі дзяржава выдзяляе сродкі грамадскім арганізацыям для прафілактычнай работы сярод насельніцтва. Такія метады актыўна выкарыстоўваюцца ў іншых еўрапейскіх краінах, а таксама ў Расіі.

**Вольга ШАЎКО.**

# Новае амплуа Святланы Сухавей

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ва ўмовах, калі сусветнае павуцінне зацягвае ўсё больш карыстальнікаў і дае ім мноства магчымасцяў, складанасці з капірайтам узнікаюць усё часцей.

— Таму так важна ў новай рэдакцыі закона адлюстраваць нормы, звязаныя з выкананнем аўтарскіх правоў пры выкарыстанні кніг, электронных выданняў і іншых твораў навукі, літаратуры і мастацтва ў бібліятэчнай дзейнасці, развіць нормы аб прававой ахове баз звестак, камп'ютарных праграм, узмацніць ахову правоў выканаўцаў, вытворцаў фанаграм і арганізацый эфірнага і кабельнага вяшчання, — падкрэслівае суразмоўніца. — Важнае месца ў законапраекце адводзіцца пытанням рэгулявання адносінаў у галіне калектыўнага кіравання маёмаснымі правамі. Выразна прапісваецца таксама стварэнне і выкарыстанне службовых твораў, спосабы аховы парушаных правоў.

